Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 МАЯ 2016 г. АЎТОРАК № 82 (28192) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Запрашаем прадаўцоў латарэек і піва

СТАР. 7



## Рэстаўрацыя: рамяство ці мастацтва?

СТАР. 9



## Нафтавыя «арэлі». Што чакае «чорнае золата»?

СТАР. 13

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў:**

*«У Пасланні Прэзідэнта беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу ішла гаворка аб маючай адбыцца палітычнай кампаніі як экзамене палітычнай культуры грамадства.*
*Але што такое палітычная культура? Гэта павага да чужога меркавання.*
*Краіна ідзе да таго, каб актывізаваць палітычную дзейнасць у сценах парламента менавіта за кошт розных пунктаў гледжання.*
*Актывізацыя палітычнай дзейнасці ўсё ж такі прадугледжвае абавязковую наяўнасць дыскусіі.*
*Трэба, каб людзі, абмяркоўваючы сумесны, хай і несупадаючы пункт гледжання, прыходзілі да адзіна правільнага рашэння, якое з'яўляецца дабром для грамадства».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 03.05.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19180,00 | ▼ |
| Еўра | 21972,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 295,22 | ▼ |
| Укр. грыўня | 765,58 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# З ВЕРАЙ, НАДЗЕЯЙ І АДКАЗНАСЦЮ



Фота БЕЛТА.

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 1 мая ў свята Уваскрэсення Хрыстовага наведаў Свята-Праабражэнскі храм у Шклове. Кіраўнік дзяржавы прысутнічаў на богаслужэнні, паставіў велікодную свечку, а затым цёпла пагаварыў з прыхаджанамі, жыхарамі раённага цэнтра, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.**

Аляксандр Лукашэнка па добрай традыцыі на Вялікдзень наведвае храмы ў рэгіёнах. У гэтым годзе кіраўнік дзяржавы пабываў на сваёй малой радзіме. Разважляючы з землякамі, Прэзідэнт адзначыў, што яму добра вядомы праблемы Шклоўшчыны, людзей, якія тут жывуць.

Беларусь як суверэнная дзяржава яшчэ маладая, для яе развіцця ўжо нямала зроблена і яшчэ вельмі многае трэба зрабіць, сказаў кіраўнік дзяржавы і дадаў, што адчувае вялікую адказнасць за беларускую зямлю. «Я нясу адказнасць перад людзьмі, якія даверылі мне гэту пасаду», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка заклікаў беларусаў адказна працаваць на сваіх месцах дзеля агульнай справы, не перакладваючы на іншых свае праблемы і абавязкі. Дзяржава ж, у сваю чаргу, акажа неабходную падтрымку. Прэзідэнт лічыць, што кожнаму на сваім месцы трэба крытычна ацэньваць, перш за ўсё, вынікі ўласнай працы, думаючы над тым, як працаваць яшчэ лепш. «І ў нас тады ўсё будзе добра», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

У час наведвання храма Аляксандр Лукашэнка выказаў удзячнасць свяшчэннаслужыцелям за важкі ўклад, які яны разам з усімі ўносяць у станаўленне і развіццё Беларусі. Кіраўнік дзяржавы павіншаваў прысутных са светлым Уваскрэсеннем Хрыстовым, пажадаў усім здароўя, доўгіх і шчаслівых гадоў жыцця, міру.

# Велікодны «карагод»



Юныя ўдзельніцы фальклорнага гурта «Крынічка» з палескай вёскі Хатынічы, што ў Ганцавіцкім раёне, наладзілі аднавяскоўцам сапраўднае свята, аднавіўшы ва ўсіх дэталях традыцыю валачобнікаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Актуальнае інтэрв'ю

**Анатоль КАЛІНІН:**



## «У краіне створаны спрыяльныя ўмовы для інвестараў»

**Віцэ-прэм'ер Анатоль КАЛІНІН курыруе ва ўрадзе досыць шырокі спектр кірункаў: ад ЖКГ да інвестыцыйнай палітыкі. Усе яны вельмі блізка датычацца жыцця кожнага жыхара нашай краіны і надзвычай актуальныя для эканомікі ў цэлым. У эксклюзіўным інтэрв'ю «Звяздзе» намеснік прэм'ер-міністра расказаў пра развіццё гэтых сфер, а таксама адказаў на шэраг іншых актуальных пытанняў.**

СТАР. 4

■ Экспертыза

## ГРАШОВАЯ БЯСПЕКА НА ПАЛЬЦАХ

**З першага ліпеня ў Беларусі з'явяцца новыя грошы. І чым бліжэй дэнамінацыя, тым больш пытанняў узнікае наконт хрумсткіх банкнотаў. Тычацца яны, безумоўна, і абароненасці грошай ад усемагчымых падробак. У сваю чаргу, карэспандэнты «Звязды» падсумавалі ўсе пытанні і звярнуліся з імі да супрацоўнікаў Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз, якія падрабязна расказалі, як новыя грошы можна будзе праверыць кожнаму чалавеку на сапраўднасць.**

СТАР. 5

V Усебеларускі народны сход

# ЛЮСТЭРКА ДЛЯ... ШАГАЛА,

## або Другое жыццё «калыскі авангарда»

**У Віцебску з'явіцца Музей гісторыі народнага мастацкага вучылішча, які насамрэч стане ўнікальным. Ён адчыніцца ў будынку, дзе выкладаў Марк Шагал і іншыя вядомыя творцы. Адсюль жа «карані» знакамітага на ўвесь свет творчага аб'яднання УНОВІС. Прыгожы будынак — былы асабняк банкіра Вішняка цудам захаваўся да нашых дзён. А сучасныя тэхналогіі дазволяць зазірнуць у мінулае. Без перабольшвання музей стане «культурнай Меккай» краіны.**



Так будзе выглядаць музей.

Дзясяткі мільярдаў рублёў, выдзеленыя з бюджэту, як сцвярджаюць мастацтвазнаўцы, акупяцца з лішкам. Бадай, за апошнія 5 гадоў не толькі на Віцебшчыне гэта адзін з самых важных аб'ектаў рэканструкцыі. І вельмі сімвалічна, што музей прыме першых наведвальнікаў у Год культуры, абвешчаны ў Беларусі.

### Дух часу і важныя дробязі

Па самых сціплых падліках, каб поўнасцю рэалізаваць задуманае, спатрэбіцца 33 мільярды рублёў. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр Косінец падчас візіту ў Віцебск адзначыў, што дзяржава падтрымлівацца праекты, якія спрыяюць павышэнню іміджу краіны.

— Бясспрэчна, гэта паслужыць станоўчаму іміджу Віцебска, дзе беражліва адносяцца да гістарычнай спадчыны. Нагадаю, што ў 2017 годзе — 130-я гадавіна з дня нараджэння Марка Шагала. А ў 2019-м — будзе святкавацца 140 гадоў з дня нараджэння Казіміра Малевіча. Тады ж споўніцца 100 гадоў, як па ініцыятыве Шагала створана Народнае мастацкае вучылішча. Гэта ўсё стане добрай нагодай для турыстаў на свае вочы ўбачыць Віцебск, — падкрэсліў Аляксандр Косінец.

Дарэчы, у наступным годзе і 80 гадоў з дня смерці Юдаля Пэна (першага настаўніка Шагала — **Аўт.**). Ён нарадзіўся ў 1854-м.

Былы старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец шмат зрабіў, каб старажытны горад стаў больш прывабным для турыстаў, утульным для гараджан. Менавіта ён спрыяў таму, каб у гістарычным будынку быў створаны музей. Гэты дом сам па сабе прыцягвае прыхільнікаў авангарда.

— Правялі ўнікальнае даследаванне, каб ён выглядаў такім, як пры Шагале і Малевічу. Яўгеній Калбовіч, навуковы кіраўнік праекта рэстаўрацыі, вельмі сур'ёзна да гэтага паставіўся. Нават зрабілі хімічныя аналізы фарбаў экстэр'еру. І дакладна ўстанавілі, што фасад быў не шэра-зялёны, як да нядаўняга часу. Ва ўспамінах тых, хто вучыўся тут маляваць, ён быў белым, — распавёў «Звяздзе» **дырэктар установы культуры «Музей «Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва» Андрэй ДУХОЎНІКАЎ.**

Ён паказаў шпалеры — копіі аўтэнтычных. Кавалак арыгінальных знайшлі падчас рэстаўрацыйных работ. Інтэр'ер аднаўлялі, выкарыстоўваючы фотаздымкі з выявамі настаўнікаў і вучняў.

— Дарэчы, мы здолелі дакладна высветліць, у якіх менавіта памяшканнях фатаграфіі былі зроблены. І павялічаныя арыгіналы «ўпішам» у сцены. Як і калектыўныя працы вучняў Малевіча. Я ўбачыў іх на выставе, калі быў за мяжой. І адразу ўзнікла думка, што прапорцыі васьмі малюнкаў адпавядаюць прапорцыі ўнутраных сцен. І вы гэта ўбачыце, — працягвае Андрэй Духоўнікаў.

На падлозе з'явіцца гранітная выява знакамітага плаката «Клінам чырвоным бі белых!» Яго ў 1920 годзе зрабіў Эль Лісіцкі, адзін з выкладчыкаў вучылішча. Будзе адноўлена майстэрня гэтага графіка, архітэктара і дызайнера. Задумана там размясціць станок для майстаркласаў па стварэнні афортаў.

Будзе і зала, прысвечаная выкладчыцы Веры Ермалаевай. Яна пасля сыходу Шагала кіравала навучальнай установай. Вядомасць атрымала і як першая ў Савецкай Расіі «канструктар» кніг для дзятвы. Яе малюнкі не толькі дапаўнялі тэксты, але і літаральна стваралі кнігу як адзінае цэлае.

Можна будзе ўбачыць у музеі і графіці Заіра Азгура, пра знаходку якіх «Звязда» паведамляла раней. Ёсць яшчэ адна: надпіс, які пачынаецца літарай «У». Мінскія рэстаўратары бяруцца дэталёва абследаваць будынак. Таму не выключаюцца новыя сенсацыі.

### А ў люстэркі пачынаеш бачыць...

На жаль, у дырэкцыі перыядычна прасілі журналіста выключыць дыктафон. Не хацелі раскрываць усе сюрпрызы.

— У Віцебску, як ні дзіўна, няма тэматычнай экспазіцыі, прысвечанай паслярэвалюцыйнаму пачатку XX стагоддзя. У нашай можна будзе даведацца не толькі пра вучылішча. Віцебск у той час, як бы цяпер сказалі, быў «культурнай сталіцай»: некалькі тэатраў, сімфанічны і духавы аркестры. У горадзе было нямала высокаадукаваных людзей. Як і тых, хто цягнуўся да мастацтва. З задавальненнем на гастролі прыязджалі артысты, паэты. Сярод іх Маякоўскі, Камісаржэўская. Менавіта гэта стала добрай «глебай» для таго, каб Шагал, заснавальнікі авангардызму, рэалізавалі свае ідэі, — дадаў Андрэй Духоўнікаў.

Шмат грошай будзе выдаткавана на куплю сістэмы падтрымкі мікраклімату. Яна дазволіць арганізоўваць выставы арыгіналаў работ з лепшых музеяў свету.

Наогул у залах будзе шмат тэхнічных прыстасаванняў. У прыватнасці, інтэрактыўны стол — у пакоі, прысвечаным Малевічу. Там, на першы погляд, будзе «чагосьці не хапаць»: мінімум мэблі. Але экскурсавод, як кажуць, «лёгкім рухам рукі» зробіць так, каб сцены пачалі паказваць і гаварыць.

Падчас экскурсіі будзе нямала нечаканага, дзякуючы арыгінальным тэхнічным рашэнням. Ад раптам убачанага «там, дзе нічога быццам бы няма», будзе перахопліваць дух...

### Пра «Віцебскую мастацкую школу»

Не раз даводзілася спрачацца наконт таго, што такое «Віцебская мастацкая школа» як унікальная культуралагічная з'ява. Адны лічаць, што маецца на ўвазе Шагал, Малевіч і іх калегі. Другія ўпэўнены, што размова ідзе пра мастацкія традыцыі, закладзеныя пераліченымі. Хоць на сённяшні дзень, мяркуючы па тыпавым афармленні віцебскіх вуліц, не верыцца, што калісьці тут нават трамвай быў аб'ектам для рэалізацыі творчых фантазій.

— Побач з музеем знаходзіцца адміністрацыйны будынак, які належыць будаўнічай арганізацыі. Калі Аляксандр Косінец быў губернатарам, агучыў ідэю стварыць комплекс з выставачнымі заламі і майстэрнямі. Вельмі хочацца, каб усё так і было. Напрыклад, пасля Шагала што было? Авангард забаранілі, пачаўся час рэалізму. Пры гэтым было нямала мастакоў высокага ўзроўню. І ў пасляваенныя, 1960-я, 1970-я, 1980-я гады ў горадзе працавалі таленты. Але на сёння няма плошчаў, каб размясціць творы мастакоў «пасляшагалаўскага часу». Упэўнены, гэта трэба зрабіць! У 1980-я гады, у прыватнасці, з'явілася творчая суполка «Квадрат». Мастакі, якім блізкія ідэі заснавальнікаў авангардызму, плённа працавалі, ездзілі з выставамі. Цудоўна, каб «Квадрату» была вылучана зала, — лічыць дырэктар музея.

Дарэчы, гэтай вясной частку вуліцы Праўды, дзе адчыняць музей, перайменавалі ў вуліцу Шагала.

— Цяпер гораду не хапае вуліцы Малевіча. На мой суб'ектыўны погляд, яна павінна быць побач з шагалаўскай, — упэўнены Андрэй Духоўнікаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*



■ Вынікі тыдня

# АПОРЫ ДЛЯ СТАБІЛЬНАСЦІ

На мінулым тыдні прадоўжыўся **ўрадавы крызіс у Іраку.** Раней з-за папрокаў у карупцыі часткі членаў дзейнага ўрада прэм'ер-міністр Хайдэр аль-Абадзі даў абяцанне памяняць міністраў, чыя рэпутацыя аказалася заплямленай. Праблема ў тым, што рашэнне павінны прыняць у парламенце, а некалькі партый, не жадаючы сыходу сваіх стаўленікаў з улады, упарта байкатуюць пасяджэнні парламента, на якіх можна было б вырашыць пытанне. У выніку 30 красавіка дэманстранты, якія пратэставалі супраць зацягвання рэформы ўрада, прарваліся ў будынак парламента з патрабаваннем ажыццявіць абяцанае раней абнаўленне кабінета міністраў.

**Расія прыняла рашэнне аб'яднаць свае намаганні ў барацьбе з санкцыямі Захаду,** накладзенымі на яе ў 2014 годзе, разам з новым саюзнікам — Зімбабвэ. Справа ў тым, што Зімбабвэ адчувае падобную праблему — на гэту краіну заходнія санкцыі былі накладзены яшчэ ў 2008 годзе. Галоўнай прычынай сталі канфіскацыі земляў у белых фермераў, хоць былі вылучаны прэтэнзіі і да выбараў. На пасяджэнні расійска-зімбабвійскай міжурадавай камісіі па эканамічным супрацоўніцтве ў Хараре было прынята пагадненне аб сумеснай барацьбе з санкцыямі. Праўда, сітуацыя ў Зімбабвэ адрозніваецца ад расійскай — ЕС ужо адмовіўся ад уведзеных раней санкцый, і галоўнай праблемай краіны з'яўляюцца санкцыі ЗША. Расіі ж даводзіцца пакутаваць і ад першых, і ад другіх.

Сталі вядомыя **вынікі першага тура прэзідэнцкіх выбараў у Аўстрыі,** якія прайшлі 24 красавіка. Інакш як сенсацыяй і трывожным званком для Брусселя іх назваць нельга. Першае месца на выбарах і вялікія шанцы на перамогу ў другім туры атрымаў лідар крайне правай Аўстрыйскай партыі свабоды (АПС), якая вядомая ў краіне і за мяжой жорсткімі антымігранцкімі заявамі. Адрыў Норберта Хофера на 16 працэнтаў ад бліжэйшага канкурэнта сведчыць аб тым, што гэтая тэма вельмі сур'ёзна трывожыць аўстрыйцаў, а палітыка ўрада па рашэнні іміграцыйнага крызісу ім не здаецца пераканаўчай. Безумоўна, з прычыны асаблівасцяў палітычнай сістэмы ўлады ў Аўстрыі ў прэзідэнта няма значных паўнамоцтваў, але пасада дае сур'ёзныя магчымасці для трансляцыі палітыкі партыі.

28 красавіка стала вядома аб выніках **чарговага раўнда перамоў па Сірыі.** Па пытанні стварэння пераходнага ўрада бакі пагадзіліся з тым, што ў яго ўвойдуць як прадстаўнікі дзейнага ўрада Сірыі, так і прадстаўнікі апазіцыйных сіл, якія ўдзельнічаюць у перамовах. Яны таксама адзначылі, што новы ўрад будзе адказваць за захаванне незалежнасці і тэрытарыяльнага адзінства краіны. Новая канстытуцыя павінна быць прынята падчас рэферэндуму, пасля чаго ў краіне павінны быць праведзены пазачарговыя выбары. Галоўным трывожным момантам з'яўляецца крохкасць перамір'я ў Сірыі, што асабліва адзначыў спецпасланнік генеральнага сакратара ААН па Сірыі Стафан дэ Містура, заклікаўшы лідараў ЗША і Расіі дапамагчы яго захаваць.

28 красавіка адбылася важная геапалітычная падзея для Расіі — **пачаў сваю работу касмадром «Усходні»,** заклікаўны пасля завяршэння дзвюх чэргаў будаўніцтва стварыць магчымасці для цалкам аўтаномнай ад іншых краін сістэмы запускаў касмічных ракет у космас. Праблема ў тым, што тэма арандавання Расіяй у Казахстана касмадрома «Байканур» стала важным момантам для ціску на ўрад краіны з боку апазіцыі, якая сцвярджае аб вялізнай экалагічнай шкодзе для Казахстана ад пускаў расійскіх ракет. Паспяховы пуск ракеты-носьбіта «Саюз-2.1а» 28 красавіка дазволіць перавесці частку пускаў з Казахстана ў Расію, тым самым палепшыўшы сітуацыю з крытыкай казахстанскай апазіцыі. Пасля ўводу ў строй другой чаргі Расія зможа пры неабходнасці ажыццяўляць у цэлым усе пускі са сваёй тэрыторыі, выкарыстоўваючы Байканур толькі ў выпадку зацікаўленасці казахстанскага боку.

27 красавіка па выніках праведзенай у кіраўніка беларускай дзяржавы нарады з нагоды маючых адбыцца парламенцкіх выбараў **былі прызначаны даты старту афіцыйнай выбарчай кампаніі (7 чэрвеня) і саміх выбараў (11 верасня).** Місіі СНД і АБСЕ таксама будуць запрошаны для назірання за парламенцкімі выбарамі ў Беларусі, у цэлым міжнародныя назіральнікі будуць запрашацца без абмежавання іх колькасці. Пры правядзенні выбараў будуць улічаны некаторыя рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ, зробленыя пасля прэзідэнцкіх выбараў 2015 года. 30 красавіка віцэ-старшыня Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (ПА АБСЕ), кіраўнік рабочай групы ПА АБСЕ па Беларусі Кент Харстэд ацаніў прынятае рашэнне як пазітыўны крок.

Таксама 27 красавіка было падпісана **сумеснае камюніке аб устанаўленні дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Ліберыяй** у пастаянным прадстаўніцтве Беларусі пры ААН у Нью-Ёрку. Тэрыторыя Ліберыі амаль у два разы меншая за тэрыторыю Беларусі, а колькасць насельніцтва — меншая ў два з лішнім разы. Узровень жыцця ліберыйца прыкладна ў васямнаццаць разоў ніжэйшы, чым узровень жыцця беларуса.

28 красавіка кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства **Уладзімір Макей удзельнічаў у 5-й сустрэчы міністраў замежных спраў краін — членаў Нарады па ўзаемадзеянні і мерах даверу ў Азіі (НУМДА).** У рамках мерапрыемства ён адзначыў, што «спалучэнне інтэграцыйных структур і праектаў заклікана забяспечыць устойлівасць «азіяцкай апоры», без якой немагчыма ўявіць сабе стабільнасць і росквіт шматпалярнага свету».

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук**

■

■ Абітурыент-2016

# Без экзаменаў!

## У шчаслівчыках — пераможцы 9 міжнародных алімпіяд

**Міністэрства адукацыі зацвердзіла пералік міжнародных алімпіяд, пераможцы якіх будуць мець у бягучым годзе права на залічэнне без уступных выпрабаванняў у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы на адпаведныя спецыяльнасці.**

Без экзаменаў змогуць паступаць абітурыенты, якія атрымалі ў гэтым годзе дыпломы I, II і III ступені на 57-й міжнароднай матэматычнай алімпіядзе (Кітай), 50-й міжнароднай Мендзялееўскай алімпіядзе школьнікаў па хіміі (Расія), 48-й міжнароднай хімічнай алімпіядзе (Грузія), 47-й міжнароднай фізічнай алімпіядзе (Швейцарыя), 28-й міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы (Расія), 27-й міжнароднай біялагічнай алімпіядзе (В'етнам), 13-й міжнароднай геаграфічнай алімпіядзе (Кітай) і 5-й еўрапейскай матэматычнай алімпіядзе для дзяўчат (Румынія).

На залічэнне без уступных выпрабаванняў маюць права і пераможцы алімпіяды школьнікаў Саюзнай дзяржавы па рускай мове і літаратуры «Расія і Беларусь: гістарычнае і духоўнае адзінства», якая праводзілася восенню 2015 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■

■ Будзе свята!

# Адзначым Перамогу разам

**На 9 мая беларусы ўбачаць салют з выкарыстаннем самых маляўнічых феерверкаў.**

Пра гэта журналістам расказаў **начальнік упраўлення інфармацыі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Уладзімір МАКАРАЎ.** Паводле яго слоў, сёлета для вогненнага шоу былі набыты новыя высакаякасныя феерверкі марак «Чырвоны мак», «Аксаміт», «Герань» і іншых, якія раней не выкарыстоўваліся. 9 мая а 22 гадзіне салют з трыццаці залпаў убачаць жыхары усіх раёнаў сталіцы, а таксама абласных цэнтраў краіны.

Святочныя мерапрыемствы ахопяць усе чатыры выхадныя дні. Ужо 6 мая ў Палацы Рэспублікі пройдуць урачысты сход і канцэрт майстроў мастацтваў «Па праве памяці жывой», які будзе ўяўляць сабой маштабнае тэатралізаванае музычнае прадстаўленне. Падчас яго прагучаць вершы беларускіх і савецкіх паэтаў, ваенныя песні. Па інфармацыі **першага намесніка міністра культуры Ірыны ДРЫГІ,** мерапрыемства спланавана так, каб зацікавіць і ветэранаў, і прадстаўнікоў сярэдняга пакалення, і — абавязкова — моладзь. У фінале канцэрта публіка пачуе ў харавым выкананні песню беларускага кампазітара Васіля Раінчыка «Кветкі Вялікай Перамогі», напісаную летась з нагоды 70-годдзя Перамогі.

7 мая ў 16:00 на пляцоўцы каля сталічнага Палаца спорту для ўсіх ахвотных разам з лаўрэатамі конкурсу «Хрустальныя зорачкі» выступіць народны артыст СССР Іосіф Кабзон. Удзел у выступленні возьмуць і іншыя выканаўцы: Руслан Аляхно, Сяргей Ваўчкоў, а таксама таленавітыя дзеці і харысты з Расіі.

Пэўна, самым цікавым мерапрыемствам для моладзі стане оўпэн-эйр «Кветкі Вялікай Перамогі», які правядуць 8 мая на той жа пляцоўцы. Удзельнікаў сустрэнуць інтэрактыўныя пляцоўкі, гістарычныя рэканструкцыі, перасоўныя выставы і многа іншае. Скончыцца святкаванне бітвай дыджэяў, якую правядуць позним вечарам.

Непасрэдна 9 мая адбудзецца адразу два знакавыя мерапрыемствы. Раніцай па праспекце Незалежнасці і цэнтральных вуліцах Мінска пройдуць удзельнікі шэсця «Беларусь памятае», удзел у якім возьмуць прадстаўнікі грамадскасці сталіцы, маладзёжных і дзіцячых арганізацый, грамадскіх аб'яднанняў. Усе яны будуць несці партрэты Герояў Савецкага Саюза, якія нарадзіліся ў Беларусі, а таксама прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў, якія вызначыліся пры вызваленні нашай краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Прынесці на шэсце памяці партрэты сваіх блізкіх, якія ўдзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне, могуць усе ахвотныя. Сустракаць дэманстрантаў на Плошчы Перамогі будуць ветэраны вайны, для якіх усталююць спецыяльную трыбуну. Скончыцца цырымонія ўскладаннем кветак да помніка, выступленнем роты ганаровай варты і святочным вальсам.

Пасля гэтага там жа пройдзе святочны канцэрт з удзелам Прэзідэнцкага аркестра Беларусі. Па словах Ірыны Дрыгі, упершыню такое мерапрыемства будзе мець масавы характар. Намеснік міністра таксама адзначыла, што шэраг знакавых мерапрыемстваў пройдзе і на іншых пляцоўках сталіцы, а таксама ў абласных і раённых цэнтрах краіны.

— Усяго ў сталіцы ў святочныя дні пройдзе больш за 70 мерапрыемстваў, — распавёў **намеснік начальніка ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Сяргей МЯДЗВЕДЗЕЎ.** — Іх накіраванасць будзе вельмі рознай: ад спорту і велапрабежак да мітынгаў-рэквіемаў у месцах пахавання салдат і масавых акцый ва ўстановах адукацыі горада. Але асноўныя сканцэнтруюцца на сямі пляцоўках, самай буйной сярод якіх будзе Палац спорту. Тут пройдзе выстава-кірмаш «Горад майстроў», спаборніцтвы па сілавым экстрыме. Для ветэранаў і ганаровых гасцей будзе ўсталяваны асобны партэр.

Спецыяльную вялікую праграму па тэме свята падрыхтавалі і сталічныя кінатэатры. Там будуць дэманстраваць фільмы, кінаўрокі і кіналекторыі пра Вялікую Айчынную. У гэтыя ж дні тэматычнай праграмай у Верхнім горадзе стартуе і музычна-турыстычны сезон. 7 мая там жа распачнецца чарговы Мінскі міжнародны форум вулічных тэатраў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

■ Надвор'е

# ЦЁПЛЕНЬКА, АЛЕ З ДАЖДЖОМ

## Чакаецца, што ў сераду на поўдні краіны прыгрэе месцамі да плюс 23 градусаў

**Сапраўды пацяплее на тэрыторыі Беларусі менавіта на гэтым тыдні, але будзе і дажджліва, паведамляе галоўны сіноптык Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Святлана РЫБАКОВА.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Ужо ў аўторак ўдзень пераважна па паўночна-заходняй палове краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымы навальніцы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе плюс 13-19 градусаў, а па паўднёвым ускодзе — да 21 цяпла. Айчынныя сіноптыкі прагназуюць, што самым цёплым днём тыдня павінна стаць серада. Праўда, 4 мая месцамі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы і нават навальніцы. Уначы і раніцай у некаторых раёнах магчымы туман. Цёпла ў гэту сераду будзе нават уначы, калі прагназуецца плюс 4-11 градусаў, удзень — 15-21 цяпла, а па паўднёвым ускодзе паветра прагрэецца да плюс 23 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, дажджы і навальніцы чакаюцца ў нас і 5 мая. Сонца стане менш, і крыху пасвяжэе. Тэмпература паветра ўначы складзе 3-10 цяпла, а ўдзень будуць камфортныя плюс 14-21.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

# ВЫРАС БЮДЖЭТ ПРАЖЫТАЧНАГА МІНІМУМУ

**З 1 мая ўстаноўлены новы бюджэт пражытачнага мінімуму (БПМ) у сярэднім на душу насельніцтва. Яго памер цяпер складае 1 699 430 рублёў (быў 1 640 000 рублёў). Ён будзе дзейнічаць па 31 ліпеня.**

Бюджэт пражытачнага мінімуму вызначаецца штоквартальна і разлічваецца ў сярэднім на душу насельніцтва, а таксама па асноўных пяці сацыяльна-дэмаграфічных групах.

✓ Для працаздольнага насельніцтва яго памер цяпер складае 3 552 670 рублёў (з 1 ліпеня — 355 рублёў 27 капеек).

✓ Сярэднедушавы мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек з 1 мая складае 2 762 410 рублёў (276 рублёў 24 капейкі), а маладой сям'і з трох чалавек — 3 024 740 рублёў (302 рублі 47 капеек).

✓ Мінімальны спажывецкі бюджэт пенсіянера зараз роўны 2 799 940 рублёў (279 рублёў 99 капеек).

✓ Для студэнта ён павялічаны да 2 645 860 рублёў (264 рублі 59 капеек).

✓ Спажывецкі бюджэт дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў складае 2 261 360 рублёў (226 рублёў 14 капеек); дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў — 2 985 380 рублёў (298 рублёў 54 капейкі); дзяцей ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў — 3 032 050 рублёў (303 рублі 21 капейка).

**ЯК ЗМЯНІЛІСЯ ДАПАМОГІ СЕМ'ЯМ, ЯКІЯ ВЫХОЎВАЮЦЬ ДЗЯЦЕЙ**

Ад БПМ залежаць памеры некаторых дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей.

✓ Так, з 1 мая штомесячная дапамога сем'ям на дзяцей ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў у перыяд выхавання дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў складае 849 700 рублёў (50% БПМ). З 1 ліпеня — 84 рублі 97 капеек.

✓ Штомесячная дапамога на дзіця-інваліда, старэйшага за 3 гады, павялічылася да 1 189 600 рублёў (70% БПМ). З 1 ліпеня — 118 рублёў 96 капеек.

✓ Штомесячная дапамога на іншых дзяцей у сям'і пры наяўнасці дзіцяці-інваліда — 849 700 рублёў (50% БПМ). З 1 ліпеня — 84 рублі 97 капеек.

✓ Штомесячная дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў — 1 699 430 рублёў (100% БПМ). З 1 ліпеня — 169 рублёў 94 капейкі.

Памер дапамогі на дзяцей да 3 гадоў (у тым ліку і на дзіця-інваліда) з 1 мая не змяніўся, бо залежыць ад памеру сярэднямесячнай зарплаты за папярэдні квартал.

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»**

Бюджэт пражытачнага мінімуму з'яўляецца асноўным крытэрыем прызнання грамадзян (сем'яў) малазабяспечанымі.

Ад бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва напрамую залежаць памеры:

— дапамог у сувязі з нараджэннем дзіцяці;
— дапамог жанчынам, якія сталі на ўлік да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці;
— дапамог на дзяцей, старэйшых за 3 гады;
— дапамог пры аднačасовым выхаванні дзяцей да 3 гадоў і ад 3 да 18 гадоў;
— мінімальных дапамог па часовай непрацаздольнасці;
— мінімальных аліментаў на дзяцей;
— сацыяльных і мінімальных працоўных пенсій (напрыклад, пенсій інвалідам, пенсій у сувязі са стратай карміцеля);
— фінансавай дапамогі ў пагашэнні крэдытаў на жыллё маладым і шматдзетным сем'ям;
— дапамог па доглядзе інваліда I групы або асобы, якая дасягнула 80 гадоў;
— субсідый беспрацоўным для пачатку прадпрымальніцтва, рамесніцтва або агратурызму;
— сацыяльных дапамог (штомесячных і максімальных аднačасовых);
— датэрміновых і дадатковых прафесійных пенсій;
— максімальнай індэксацыі даходаў насельніцтва (некаторых дапамог, стыпендый, заробкаў, у тым ліку мінімальнай зарплаты) у сувязі з інфляцыяй.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by*

■ Факт

# НА ПЕРАГАВОРЫ... ВЕЛАСІПЕДАМ



Фота БЕЛТА.

Менавіта гэты транспартны сродак выбрала наша дэлегацыя на чале са **старшынёй Гродзенскага аблвыканкама Уладзімірам КРАЎЦОВЫМ** для паездкі ў Падляскае ваяводства Польшчы. Мэта візіту — перагаворы з кіраўніцтвам гэтага рэгіёна па актывізацыі турыстычнай актыўнасці ў раёне Аўгустоўскага канала. Не зусім традыцыйныя для дзяржаўных служачых сродкі перамяшчэння далі магчымасць членам дэлегацыі адчуць на практыцы — як гэта, перасякаць мяжу без візы па веласіпедным маршруце Белавежскай пушчы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

# ВЯЛІКДЗЕНЬ ПРАЙШОЎ СПАКОЙНА

**Падчас правядзення ў сталіцы ўрачыстых набажэнстваў, прымеркаваных да Вялікадня, адміністрацыйных правапарушэнняў і іншых здарэнняў не зафіксавана, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама.**

Усяго, па звестках мінскай міліцыі, у 40 праваслаўных храмах і прыходах узялі ўдзел у набажэнствах каля 235 тысяч чалавек. Найбольшая колькасць грамадзян наведала храм у гонар іконы Божай Маці «Усіх Смуткуючых Радасць» (42 тысячы), Свята-Духаў кафедральны сабор (36 тысяч), царкву ў гонар прападобных Старцаў Опцінскіх (17 тысяч), прыход храма ў гонар святціеля Мікалая Японскага (12 тысяч), Царкву Святой Роўнаапостальнай Марыі Магдалены (11 тысяч).

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# Гонар Чэрвеньшчыны

**Параўнальна нядаўна, у 2009 годзе, у Чэрвені, на Міншчыне, з'явілася вуліца з імем Давыда Голуба. А днямі на адным з будынкаў усталявана мемарыяльная дошка ў гонар славутага земляка.**

— Мой бацька — Давыд Майсеевіч Голуб, нарадзіўся ў Чэрвені, — расказвае дачка акадэміка Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі Галіна Давыдаўна Голуб, — ён заўсёды быў уважлівы да роднай старонкі, стараўся ўсямерна дапамагаць сваім землякам. Пражыўшы 100 гадоў, ён дасягнуў неверагодных вышынь у навуцы. Сваю захопленасць медыцынай перадаў многім сваім наступнікам.

Можна толькі падзякаваць землякам-чэрвеньцам, што яны так дастойна ўшанавалі памяць заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР. І выказаць спадзяванне, што з часам на чэрвеньскай вуліцы Акадэміка Давыда Голуба яшчэ з'явіцца і помнік славутаму земляку.

**Сяргей ШЫЧКО**

■ А не шкодзь!

# За бабра — 25 мільёнаў

**Браканьера, які займаўся пры дапамозе сілаў, затрымалі супрацоўнікі Бялыніцкай міжраённай інспекцыі ў пойме ракі Вабіч. Парушальніка дзяржінспектары заўважылі, калі патрулявалі суседні вадаём — возера Бушоўка Круглянскага раёна.**

— Падабраўшыся бліжэй, яны зразумелі, што мужчына правярае ўстаноўленыя на беразе ракі сілы. Інспектары зафіксавалі факт парушэння на відэа, пасля чаго затрымалі незнаёмца, — паведаміла **прэс-сакратар Дзяржінспекцыі Вольга ГРАМОВІЧ.** — Пры аглядзе берагавой лініі на двухсотметровым адрэзку рэйдавая група знайшла восем металічных сілаў. Пры іх дапамозе браканьер спрабаваў здабыць баброў. Мужчына быў з суседняй вёскі Ступлявы. Ідучы да дома затрымана, дзяржінспектары ў кустах на другім беразе ракі знайшлі яшчэ чатыры сілы — ужо ўстаноўленыя на капытных.

У доме браканьера былі знойдзены свежае мяса і шкура бабра. Парушальнік прызнаўся, што здабыў яго ранкам. За паляванне забароненымі прыладамі ў забаронены час мужчыну пагражае штраф да 10,5 мільёна рублёў. Таксама давядзецца пакрыць шкоду за незаконную здабычу ў памеры 14,7 мільёна рублёў.

**ДА ВЕДАМА.** Паляванне на бабра дазволена з 1 верасня па 31 сакавіка. Прычым карыстацца сіламі катэгарычна забаронена. Да таго ж бабёр адносіцца да нармаваных відаў паляўнічых жывёл, і здабываць яго можна па спецыяльным дазволе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# «У краіне створаны спрыяльныя ўмовы для інвестараў»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

***— Анатоль Мікалаевіч, у найбліжэйшы час чакаецца візіт кіраўніцтва Сусветнага банка ў Беларусь для абмеркавання новых праектаў. Пра якія праекты ідзе гаворка?***

— Хачу адзначыць, што галоўная перавага ўзаемадзеяння з Сусветным банкам — магчымасць рэалізацыі інавацыйных, прарыўных праектаў, запатрабаваных у сусветнай эканоміцы. Тым самым мы выходзім на новы тэхналагічны ўзровень. Развіццё інфраструктуры, энергазберажэнне і энергаэфектыўнасць, экалогія — гэта нашы прыярытэтныя і найбольш актуальныя сферы ўзаемадзеяння. На працягу ўжо дваццаці гадоў урад Беларусі паспяхова супрацоўнічае з Сусветным банкам. Агульная сума пазыковых сродкаў ацэньваецца ў 1 млрд долараў ЗША.

У якасці прыкладу ўзаемавыгаднага партнёрства назаву шэраг праектаў у транспартнай сферы. У прыватнасці, мы ўжо рэалізавалі праект на міжнародным калідоры М5. Цяпер вядзецца праца па выбары генпадраднай арганізацыі для ўчастка дарогі М6 Мінск — Гродна — мяжа Рэспублікі Польшча. Мы плануем ужо ў маі прыступіць да рэалізацыі гэтага праекта.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца сумесным праектам у сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Рэалізуецца 2 праекты ў сектары водазабеспячэння і абыходжання з камунальнымі адходамі. Уведзены ў эксплуатацыю 23 аб'екты водазабеспячэння і водаадвядзення, завяршаецца будаўніцтва буйнога смеццесартавальнага завода ў Гродне.

Урад звярнуўся да кіраўніцтва Сусветнага банка, каб пашырыць супрацоўніцтва ў сферы абыходжання з адходамі. Мы прапануем стварыць так званы кластар па перапрацоўцы цвёрдых камунальных адходаў у Гродзенскай вобласці. Гэта дазволіць нам да 70% павялічыць долю выкарыстання цвёрдых камунальных адходаў у выглядзе альтэрнатыўнага RDF-паліва і яго наступнага выкарыстання пры вытворчасці цэменту і ў кацельнях камунальнай гаспадаркі для цеплазабеспячэння спажыўцоў. Акрамя таго, абмяркоўваюцца перспектывы нашага партнёрства ў рамках дзяржаўнай праграмы «Чыстая вада» з мэтай паляпшэння якасці пітной вады. Супрацоўніцтву з Сусветным банкам у сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі ўдзяляецца вялікая ўвага, паколькі рэалізацыя сумесных праектаў у гэтай сферы накіраваная на паляпшэнне экалагічнай абстаноўкі, павышэнне ўзроўню здароўя і дабрабыту насельніцтва.

Асаблівая ўвага надаецца павышэнню эфектыўнасці цеплазабеспячэння за кошт павелічэння выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі ў жыллёва-камунальнай гаспадарцы, у першую чаргу драўнянага паліва. Так у 2017-2020 гадах пры фінансавай падтрымцы Сусветнага банка плануецца перавесці 50 кацельняў магутнасцю больш як 350 МВт на выкарыстанне мясцовых відаў паліва.

***— Па планах урада, доля арэнднага жылля ў Беларусі будзе павялічвацца. Гэта павінна адыграць важную ролю ў вырашэнні пытанняў працоўнай міграцыі. У якіх гарадах плануецца будаўніцтва такога жылля? Ці будуць мяняцца планы ў сувязі з эканамічнай сітуацыяй ў краіне?***

— У рамках выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы сваё далейшае развіццё атрымае арэнднае жыллё, якое спрыяе працоўнай мабільнасці грамадзян. Жыллё такога тыпу — гэта сапраўды магчымасць для насельніцтва свабодна мігрываць да новых месцаў працы, што, у сваю чаргу, і дазваляе стаць грамадству больш мабільным. На 1 студзеня 2016 года фонд арэнднага жылля складаў 35,6 тысячы жылых памяшканняў агульнай плошчай больш за 2 млн кв. метраў. Аб'ём сродкаў, атрыманых ад здачы жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання ў краіне, складае 132,5 млрд рублёў.

Акрамя таго, з 1 ліпеня 2016 года фонд жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання папоўніцца за кошт уключэння ў яго непрыватызаванага дзяржаўнага жылля.

У 2016 годзе ў цэлым па Беларусі запланавана будаўніцтва каля 2 тыс. арэндных кватэр. Такое жыллё будуецца ва ўсіх абласцях, а таксама і Мінску. Калі ж гаварыць пра перспектыву на бліжэйшыя гады, то аб'ёмы будаўніцтва арэнднага жылля будуць вызначацца з улікам бюджэтных рэсурсаў, што выдзяляюцца на гэтыя мэты.

***— Наколькі наша будаўнічая галіна цікавая замежным інвестарам?***

— З абсалютнай упэўненасцю можна сказаць, што ў Беларусі створаны сапраўды прывабныя ўмовы для інвестараў, у тым ліку ў будаўнічай галіне.

Нарматыўна-прававая база па інвестыцыйнай дзейнасці прадстаўлена дастаткова шырока. Пра тое, што цікавасць замежных інвестараў да будаўнічай галіны пастаянна расце, сведчаць шматлікія сучасныя праекты, якія паспяхова рэалізуюцца як у нашай краіне, так і за яе межамі.

Так, напрыклад, цяпер у Беларусі вядзецца будаўніцтва гіпсавага завода ў пасёлку Гатава — чарговы этап маштабнага інвестыцыйнага праекта, які рэалізуецца міжнароднай кампаніяй «Волма» пры падтрымцы ўрада Беларусі.

Завод па вытворчасці будаўнічых матэрыялаў будзе абсталяваны найноўшымі тэхналогіямі. На прадпрыемстве будзе створана 180 новых працоўных месцаў. Гэта вялікі ўклад у эканоміку нашай краіны новых тэхналогій, якія дазволяць больш інтэнсіўна развівацца будаўнічаму комплексу.

Таксама высокую зацікаўленасць у рэалізацыі сумеснага інвестыцыйнага праекта па мадэрнізацыі і развіцці ААТ «Красносельскбудматэрыялы» праяўляе ірландская кампанія «CRH» — вядучы сусветны вытворца цэменту і будаўнічых матэрыялаў.

Паказальным прыкладам служыць і двухбаковае крэдытна-інвестыцыйнае супрацоўніцтва Беларусі і Кітая. Сёння самы маштабны сумесны праект, разлічаны на дзесяцігоддзі, — кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень».

У парку будуць сканцэнтраваны інавацыйныя вытворчасці з высокім экспартным патэнцыялам, будзе дзейнічаць адмысловы прававы рэжым і забяспечаны аптымальныя ўмовы для вядзення бізнесу. Ужо сёння ў парку ёсць першыя рэзідэнты, што і пацвярджае цікавасць замежных інвестараў.

Не менш маштабны праект: шматфункцыянальны комплекс «Мінск-Мір», будаўніцтва якога стартавала ў кастрычніку 2015 года. Ён размесціцца на плошчы 320 га на тэрыторыі былога аэрапорта «Мінск-1». Там з'явіцца 30 тыс. кватэр, новы парк плошчай 50 га, чатыры школы і дзевяць дзіцячых садкоў, гандлёвы і фінансавы цэнтры, станцыя метрапалітэна.

Цэнтр прыцягне сур'ёзны аб'ём замежных інвестыцый, вялікую колькасць міжнародных кампаній, якія будуць працаваць тут і тым самым папулярызаваць Беларусь на сусветным рынку.

***— За апошні год мы істотна рушылі наперад у галіне дзяржаўна-прыватнага партнёрства. У чым, на ваш погляд, заключаюцца яго перавагі?***

— У мэтах фарміравання прававой асновы для развіцця механізму такога партнёрства ў Беларусі прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве». Урадам вядзецца работа па падрыхтоўцы шэрагу падзаконных актаў. Рэалізацыя праектаў дзяржаўна-прыватнага партнёрства мае шэраг істотных пераваг: гэта магчымасць прыцягнення інвестыцый, інавацыйных тэхналогій і рэсурсаў прыватнага бізнесу для вырашэння пытанняў, якія знаходзяцца ў зоне адказнасці дзяржавы. Размеркаванне рызыкі паміж прыватным і дзяржаўным партнёрамі прадугледжвае глыбокую прапрацоўку неабходных дакументаў для правядзення конкурсу па выбары прыватнага партнёра.

Актуальнасць і прывабнасць для бізнесу пілотнага праекта мадэрнізацыі дарогі М-10 адзначана і на міжнародным узроўні. Правядзенне конкурсу па адборы прыватнага партнёра па гэтым праекце запланавана на першую палову 2017 года. Да гэтага тэрміну будуць вызначаны абавязкі прыватнага і дзяржаўнага партнёраў.

Што тычыцца сістэмы ЖКГ, то зараз прыватны бізнес прысутнічае ў сферы як падрадчык. Але ў мэтах далейшага развіцця неабходна прыцягваць прыватны бізнес як партнёра і для гэтага ў Нацыянальны інфраструктурны план увайшлі такія аб'екты, на якія ў дзяржавы недастаткова сродкаў на рэалізацыю.

***— У Беларусі распрацоўваюцца меры па актывізацыі дзеянняў у сферы электроннага ўрада. Як і калі павялічыцца прысутнасць электроннага ўрада ў інтэрнэце?***

— Давайце спачатку дамовімся, што называць «электронным урадам».

Электронны ўрад — гэта выкарыстанне ў дзяржаўных структурах інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, якія дазваляюць палепшыць іх працу, павысіць узровень аказваемых імі паслуг на фоне правядзення арганізацыйных рэформаў. Калі прасцей, тэрмін «электронны ўрад» азначае электронныя метады кіравання.

У рамках яго развіцця ў Беларусі створана і актыўна выкарыстоўваецца сістэма міжведамаснага электроннага дакументаабароту. Сёння больш за 2100 дзяржаўных органаў і арганізацый падлучаны да гэтай сістэмы. Гэта дазволіла скараціць час дастаўкі дакументаў з 2 сутак да 15 хвілін. Такім чынам вырасла аператыўнасць прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў.

Развіваецца агульнадзяржаўная аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма, да якой падлучаюцца ведамасныя інфармацыйныя рэсурсы. Гэта як цэнтр канцэнтрацыі інфармацыі, якая дазваляе выключыць лішнюю перапіску паміж дзяржаўнымі органамі і арганізацыямі. Калі ёсць неабходнасць атрымання інфармацыі з той ці іншай базы звестак, то яе можна атрымаць з гэтай адзінай сеткі, пазбегнуўшы падлучэння да кожнай базы асобна.

Сёння ў прыватнага бізнесу ёсць магчымасць падачы падатковай і статыстычнай справаздачнасці ў электронным выглядзе. Наступным крокам будзе рэвізія і максімальны перавод у электронны выгляд адміністрацыйных працэдур. Гэта дасць істотную эканомію часу і сіл, а таксама дазволіць выключыць суб'ектывізм ва ўзаемаадносінах з чыноўнікамі.

Укараненне электроннага ўрада немагчыма без адпаведнага развіцця інфармацыйна-камунікацыйнай інфраструктуры, калі мадэрнізуецца існуючая сетка перадачы інфармацыі, будуюцца сеткі, якія выкарыстоўваюць тэхналогіі сувязі новага пакалення. Актыўна развіваецца і становіцца папулярнай бесправадная перадача звестак.

***— Нядаўна вы даручылі прыняць меры па павышэнні якасці паслуг сотавай электрасувязі. Якія рэгіёны краіны патрабуюць прыняцця такіх мер?***

— Мінсувязі на пастаяннай аснове праводзіць маніторынг і аналіз сітуацыі па забеспячэнні ўстойлівага пакрыцця тэрыторыі краіны сеткамі сотавай рухомай электрасувязі. У цэлым тэрыторыя Беларусі пакрыта гэтымі сеткамі, і няма рэгіёнаў, у якіх існуюць сістэмныя праблемы з якасцю сувязі.

Аднак маюцца асобныя, маланаселеныя, цяжкадаступныя тэрыторыі, часам участкі дарог, месцы аграэкатурызму, дзе ёсць неабходнасць павелічэння прапускной здольнасці сетак. Ёсць участкі няўстойлівай сувязі. Я зрабіў адпаведныя даручэнні, і ўжо зараз праводзіцца работа па аптымізацыі параметраў сетак сотавай электрасувязі, мадэрнізацыі існуючых аб'ектаў сувязі на гэтых участках, а таксама па будаўніцтве дадатковых базавых станцый.

Таксама ўкараняюцца новыя тэхналогіі, якія пашыраюць зоны абслугоўвання за кошт паляпшэння параметраў пранікнення і змяншэння залежнасці ад перашкод. Гэта дазваляе проста і хутка развіваць мабільную сувязь і высакахуткасны інтэрнэт у сельскіх раёнах. Па нашай ацэнцы, разгортванне сетак трэцяга пакалення ў дыяпазоне частот 900 МГц істотна палепшыць паказчыкі якасці сотавай сувязі ўздоўж асноўных дарог і на тэрыторыях з шчыльнай гарадской забудовай.

Неабходна адзначыць, што ў снежні мінулага года ў Мінску ўвялі ў эксплуатацыю сетку сотавай рухомай электрасувязі чацвёртага пакалення па тэхналогіі LTE. Яна дазваляе канчатковаму карыстальніку атрымліваць сучасныя інтэрнэт-паслугі з вялікай хуткасцю і высокай якасцю. Да канца гэтага года чакаем, што тэхналогія прыйдзе ва ўсе абласныя гарады, а да канца 2018 года — у раённыя цэнтры і іншыя населеныя пункты з колькасцю насельніцтва ад 50 тысяч чалавек.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

Напярэдадні

## МЫ ПАКАЖАМ СВАЕ ПРАМЫСЛОВЫЯ ІНАВАЦЫІ



**Беларускі прамысловы форум — 2016 пройдзе ў Мінску ў Футбольным манежы з 3 па 6 мая. Старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Аляксандр ШУМІЛІН расказаў, што там будуць прадстаўлены беларускія інавацыі сусветнага ўзроўню.**

Напрыклад, будзе прадэманстравана ўстаноўка для мокрай ачысткі вентыляцыйнага паветра ад шкодных рэчываў. Гэта распрацоўка БНТУ, якая забяспечвае высокі ўзровень якасці. Сістэма ўнікальная і не мае аналагаў ва ўсім свеце. На выставе таксама прадставяць абсталяванне новага пакалення для абясшкоджвання медыцынскіх адходаў, універсальны рабатызаваны комплекс і аўтаматызаванае абсталяванне для ўшчыльнення, герметызацыі і склейвання.

Нацыянальная акадэмія навук таксама прадставіць свае распрацоўкі. У іх ліку новы кампазіцыйны магнітны матэрыял, які дазваляе замяніць ламінаваную электрамагнітную сталь для вырабаў накшталт трансфарматараў, высокаабаротных электрарухавікоў, генератараў. Навукоўцы Акадэміі навук прадставяць таксама прыборы для вызначэння фізіка-механічных уласцівасцяў будаўнічых матэрыялаў. Гэта абсталяванне дазваляе вызначаць якасць асфальтабетону, бетону і іншых матэрыялаў без адбору проб.

Беларускі прамысловы форум — маштабны міжнародны выставачны праект, які спрыяе павышэнню інавацыйнай актыўнасці арганізацый усіх формаў уласнасці. Ён таксама паляпшае сувязі паміж навукай і вытворчасцю. Ад мерапрыемства чакаюць, што яно стане ўнікальнай пляцоўкай для дыялогу паміж прадстаўнікамі прамысловых карпарацый, банкаўскіх структур, малога і сярэдняга бізнесу, навукоўцамі. Ужо цяпер для ўдзелу зарэгістравана больш за 200 экспанентаў — вядучых прадстаўнікоў усіх сектараў айчыннай і замежнай прамысловасці. Чакаецца, што падчас форуму будзе падпісана не менш за 30 доўгатэрміновых пагадненняў.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

## МОЖНА СТАЦЬ ЧАРАЎНІКОМ

**У маі-чэрвені Беларускі дзіцячы хоспіс, што пабудаваны ў пасёлку Вопытны Мінскага раёна, плануе правесці азеляненне і добраўпарадкаванне тэрыторыі. А для гэтага спатрэбяцца сродкі. Іх збор у межах сацыяльнага праекта «Звычайны цуд» ужо аб'яўлены.**

Усім, хто вырашыць падтрымаць праект, прапануецца ахвяраваць адну з указаных сум: 100 000 рублёў, 500 000, 1 000 000, 2 000 000, 5 000 000, 10 000 000, 20 000 000 і г.д. Усіх ахвяравальнікаў чакаюць падарункі. Тыя, хто падорыць 100 000 і 500 000, атрымаюць насенне «Чароўных палачак» у дызайнерскай упакоўцы. Мецэнаты такіх сум, як 1 000 000, 5 000 000 і г.д., атрымаюць сапраўдныя Чароўныя палачкі, выробленыя мастакамі і іншымі творчымі людзьмі з розных матэрыялаў і ў розных тэхніках. А самыя буйныя спонсары — ад 20 000 000 рублёў — атрымаюць Чароўныя палачкі ў эксклюзіўным выкананні і ўнікальную кнігу філасофскіх казак, створаную спецыяльна для праекта.

Вынікі будуць падведзены 29 мая. Падрабязней аб тым, як пералічыць грошы, чытайце на сайце newhospice.by у раздзеле «Як дапамагчы». Пры пералічэнні сумы пасля прозвішча неабходна дапісаць слова «Цуд». За навінамі праекта «Звычайны цуд» сачыце на партале ВОЛШЕБНИК.БЕЛ.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

# ГРАШОВАЯ БЯСПЕКА НА ПАЛЬЦАХ


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

— Дзякуючы Нацыянальнаму банку, мы ўжо маем узоры новых беларускіх грошай, — пачынае гутарку **Аляксандр МАЖЭЙКА, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення крыміналістычных экспертыз цэнтральнага апарату Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз** *(на фота)*. — Мы прайшлі спецыяльныя курсы падрыхтоўкі, і ўсе нашы супрацоўнікі гатовы да правядзення неабходных экспертыз на высокім узроўні. Усё ж такі, каб вывучыць банкноты, іх трэба патрымаць у руках, даследаваць элементы абароны.

***— Як вы ацэніце абароненасць нашых будучых грошай?***

— Лічу, што яны вельмі добра абаронены. Некаторыя элементы, пра якія далей пойдзе гаворка, не ўжываюцца шырока ў іншых краінах. Па дызайне купюры таксама даволі прыгожыя. Думаю, людзям яны спадабаюцца, а зрабіць даволі якасныя падробкі зламыснікам будзе вельмі складана.

***— Ці прагназуеце ўсплёск махлярства адразу пасля дэнамінацыі?***

— На першым этапе падобнае можа быць. Асабліва трэба засцерагчы пажылых людзей, да якіх могуць прыходзіць зламыснікі і прапаноўваць абмяняць грошы. Нацыянальны банк ужо паведамляў, што датэрміновага абмену грошай не будзе, а новыя паступяць у абарачэнне толькі з 1 ліпеня 2016 г. Трэба засцерагчы і дзяцей, каб тыя не пачалі сваволіць і рабіць каляровыя копіі грошай. Усё ж такі гэта таксама крымінальны ўчынак, за які людзі нясуць адказнасць.

***— Як можна будзе самастойна праверыць сапраўднасць банкнотаў?***

— Найперш, каб пазбегнуць ашуканства, трэба ведаць знешні выгляд новых грошай. Гэта асноўнае, — кажа Аляксандр Мажэйка.

— Вось жывы прыклад, — дадае і паказвае экзатычную банкноту **Сяргей ГВІШЧ, начальнік аддзела ўліку паліграфічнай вытворчасці галоўнага ўпраўлення крыміналістычных экспертыз цэнтральнага апарату Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз.** — Гэта тысяча сурынамскіх гульдэнаў. Купюра сапраўдная, змяшчае элементы абароны: вадзяныя знакі, мікратэкст... Але на ёй надрукавалі надпісі і спрабавалі выдаць за тысячу еўра, хоць такая банкнота проста не існуе ў прыродзе. 500 еўра — максімальны намінал.

— У новых беларускіх грошай 7 наміналаў, выявы якіх можна ўбачыць у інтэрнэце, на плакатах, у газетах. На кожным з іх змешчаны малюнкі, прысвечаныя кожнай вобласці і Мінску. На пяцідзясятцы, напрыклад, размешчаны малюнак Мірскага замка, на пяцёрцы — Камянецкая вежа, на пяцісотцы — Нацыянальная бібліятэка. Навобмацак грошы мусяць быць хрумсткімі, шурпатымі. Іх пастаянна камячаць, складаюць напалам, але яны павінны доўгі час не губляць свой знешні выгляд і не мець пашкоджанняў, надрываў. Неабходную эластычнасць, трываласць надаюць баваўняныя валокны, якія ўваходзяць у склад банкнотаў. Папяровыя грошы павінны прасвечвацца, а таксама мець шэраг элементаў абароны:

## ВАДЗЯНЫЯ ЗНАКІ

Адным з відаў абароненасці новых банкнот з'яўляюцца вядомыя і раней вадзяныя знакі, якія можна ўбачыць толькі на прасвеце. Яны ўнікальныя для кожнай банкноты. Паўтараюць той малюнак, які можна ўбачыць.



## СУМЯШЧАЛЬНЫЯ ВЫЯВЫ

З аднаго боку мы бачым рэльефную лінію. Тое самае і з адваротнага боку. Так працуе і абаронная нітка, яшчэ адзін з элементаў абароны грошай.





## КРЫЖЫК, ПРАМАВУГОЛЬНІК, КВАДРАТ — ВЫЯВЫ ДЛЯ НЕВІДУШЧЫХ

На кожнай купюры знаходзяцца графічныя элементы, што адчуваюцца навобмацак. Зроблены яны для таго, каб невідушчыя людзі маглі адрозніць наміналы купюр. На кожным грашовым білеце надрукавана свая фігура. На купюры ў пяць рублёў у ніжнім левым куце змешчаны прамавугольнік, на дзясятцы — кола, на банкноце ў 20 рублёў — квадрат, на пяцісотцы — крыжык... Яны лёгка адчуваюцца пальцамі. Чалавек можа адчуць і зразумець, што гэтая купюра менавіта такога наміналу, а не іншага.



## МАНЕТЫ

Яны нядрэннай якасці. Выкананы ў розных колерах: 1, 2, 5 капеек — меднага колеру, 10, 20, 50 капеек — жоўтыя, 1 рубель — белы, а 2 рублі — сплаў жоўтага і белага колераў. Чым вышэй намінал, тым лепей сістэма абароны. На гурце (тарцовай частцы) двухрублёвай манеты дробна выкананы надпіс «Беларусь». Усе манеты, калі падаюць, павінны гучна звінець, а не выдаваць глухі гук.

***У нас найчасцей падрабляюць долары ЗША, еўра, расійскія і беларускія рублі.***

***«Калі чалавек сумняваецца ў сапраўднасці грошай, ён можа звярнуцца ў наш камітэт. Мы праводзім экспертызы для фізічных і юрыдычных асоб. Нашы супрацоўнікі акажуць неабходную дапамогу, каб чалавек на першым этапе не патрапіў у непрыемную сітуацыю».***

## ЭФЕКТ MASK

На купюрах наміналам ад 50 рублёў знаходзіцца MASK, дадатковы элемент абароны, які складаецца з дзвюх выяў. Яны выкананы рознымі спосабамі друку, але аднолькавымі фарбамі. На прасвеце можна прачытаць намінал купюры.



## АБАРОННЫЯ ВАЛОКНЫ

Гэта яшчэ адзін від абароны банкнот. Яны бачны простым вокам. Але калі купюры прынесці ў банк, наяўнасць валокнаў можна лёгка праверыць праз ультрафіялет.



**Тарас ШЧЫРЫ.** *taras@zviazda.by*



# «КУЗНЯ ЧЭМПІЁНАЎ» ДЛЯ БІЯТЛОНА

## Для таго, каб колькасць медалёў на міжнародных спаборніцтвах павялічвалася, у нашай краіне рэалізуецца адмысловы праект

**На тэрыторыі былога ваеннага гарадка ў пасёлку Баравуха-1 пад Наваполацкам знаходзіцца вучылішча, дзе рыхтуюць маладых спартсменаў, якія павінны праславіць Беларусь. Выпускнікі ўжо гэта зрабілі.**

— У наступным годзе Наваполацкаму дзяржаўнаму вучылішчу алімпійскага рэзерву споўніцца 15 гадоў. За параўнальна невялікі прамежак часу тут створаны добрыя ўмовы для трэніровак, заняткаў і жыцця навучэнцаў. Сфарміраваўся высокапрафесійны склад выкладчыкаў. Як вынік — вучылішча падрыхтавала шмат выдатных спартсменаў, — падкрэсліў **старшыня Наваполацкага гарвыканкама, кіраўнік гарадскога аддзялення Беларускай федэрацыі біятлона Дзмітрый ДЗЯМІДАЎ**.



Тут, у прыватнасці, вучыліся біятланісты Ганна Сола, Віктар і Ірына Крыўко, Яўген Абраменка. Усё яны прысутнічалі на афіцыйным адкрыцці праекта «Кузня чэмпіёнаў».

— «Зорнай хваробы» не маю. Часта бываю тут, калі трэба, застаюся і на ноч. З задавальненнем дзялюся вопытам. Удзячны трэнерам за тое, што дапамаглі стаць добрым спартсменам. Мне падабаюцца вялікія нагрузкі, стомленасць пасля іх, — падзяліўся на прэзентацыі новага праекта **Віктар КРЫЎКО, двухразовы пераможца Чэмпіянату Еўропы сярод юніёраў (2016 год), бронзавы прызёр Алімпійскага еўрапейскага фестывалю моладзі (2013 год)**.

Дыплом выпускніка ён атрымаў летась. У вучылішчы сем аддзяленняў: лыжных гонак, цяжкай атлетыкі, плавання, біятлона... Біятланісты займаюцца яшчэ і ў эксперыментальнай групе.

— Яе стварылі па ініцыятыве Грамадскага аб'яднання «Беларуская федэрацыя біятлона». Набралі сем чалавек з Мінскай, Віцебскай, Гомельскай абласцей. Лепшыя з лепшых былі выбраны спецыяльна для гэтых заняткаў. Конкурс на месца атрымаўся на ўзроўні прэстыжных ВНУ, — расказаў карэспандэнту «Звязды» **трэнер-выкладчык Васіль ЛЕШЧАНКА**.

Трэніруе будучых беларускіх алімпійцаў і расіянін. А на трэніроўкі прыязджаюць нават... японцы.

— Справа ў тым, што ў Японіі да 20 гадоў не дазваляецца трымаць у руках зброю. А трэніравацца ж трэба з юнацтва, — патлумачыў трэнер.

Ён дазволіў журналісту «Звязды» прыцэліцца з вінтоўкі. Аказалася, гэта не так проста: незразумела было, як руку прыкласці да прыклада, ды і зброя аказалася больш цяжкай па вазе, чым падавалася. Трэнер цярпліва дапамог і супакоіў, маўляў, не адразу прыстасоўваюцца і прафесійныя ваенныя ў адстаўцы. Паказаў і прыладу, каб разглядзець, наколькі дакладна зроблены стрэл. Праз яе ўсё бачна літаральна як на далоні.

У «арсенале» біятланістаў ёсць і снежная гармата... А траса Наваполацкага вучылішча лічыцца адной з самых складаных.

Для праекта «Кузня чэмпіёнаў» адораных хлопцаў і дзяўчат будуць адбіраць па ўсёй краіне. Падобны праект ажыццяўляецца ў лёгкай атлетыцы па ініцыятыве старшыні адпаведнай федэрацыі Вадзіма Дзевятоўскага.

— Як будзем «дзяліць» таленавітых? Мы, лічу, не канкурэнты. Упэўнены, ёсць юныя кандыдаты на поспех і ў іншых відах спорту. Калі іх своечасова знаходзіць, медалёў будзе шмат на чэмпіянатах свету і алімпійскіх гульнях! — адказаў на пытанне «Звязды» **генеральны сакратар Беларускай федэрацыі біятлона Анатоль СТРОМСКІ**.

Праект «Кузня чэмпіёнаў» вельмі амбіцыйны. Справа ў тым, што лёгкай атлетыкай займаюцца на школьных занятках фізкультуры, а вось біятлон у многіх раёнах бачылі толькі па тэлебачанні.

— Праект накіраваны на тое, каб знайсці ў правінцыі адораных дзяцей. Дапамогуць нам у гэтым настаўнікі фізкультуры. Пасля пільнага вывучэння фізічных і псіхалагічных магчымасцяў будзем прапаноўваць падлеткам паступіць у наша вучылішча. Тут ёсць усё неабходнае, каб максімальна развіць свае якасці. Захочуць трэніравацца і вучыцца ў іншых рэгіёнах, створым умовы і там, — працягвае спадар Стромскі.



Падчас прэзентацыі «Кузні чэмпіёнаў» спартсмены і ветэраны спорту сустрэліся з навучэнцамі Наваполацкага вучылішча. Запрасілі на акцыю і балельшчыкаў. Апошнія выстройваліся ў чэргі па аўтографы «зорак». На памяць пра падзею пасадзілі «Дрэва чэмпіёнаў».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*pukshanski@zviazda.by*

*Баравуха — Наваполацк — Віцебск.*

■ Новыя тэхналогіі

# ПРАГРЭС ПРЫ ДАРОЗЕ

## Бензакалонкі без аператараў і электразарадныя станцыі — якія яшчэ стандарты АЗС будучыні ўжо рэалізуюцца

**Тыя, хто часта ездзіць па беларускіх аўтамагістралях, ужо звыкліся, што аўтазаправачная станцыя — гэта не толькі бензакалонка. Як мінімум, каля яе павінны быць крама, прыбіральня, кавярня... Адметна, што яшчэ нейкіх 10 гадоў таму падобных патрабаванняў да АЗС не было. А што цяпер?**

### БУДУЧЫНЯ ЗА АЎТАМАТЫКАЙ

**Намеснік генеральнага дырэктара РУП «Беларуснафта» Сяргей КАМОРНІКАЎ** распавёў журналістам, як прадпрыемства ўводзіць сучасныя стандарты на сваіх аб'ектах. Аб'яднанню сёлета спаўняецца 50 гадоў, на сённяшні дзень у яго сістэме 554 АЗС. Гэта толькі адзін з блокаў сістэмы нафтапрадуктазабеспячэння прадпрыемства (здабычы нафты, газаперапрацоўкі, навуковых даследаванняў і інш.), але, бадай, ён адзін з найбольш блізкіх шараговаму спажыўцу. Для параўнання: першая АЗС была пабудавана ў Рэчыцы ў 1997 годзе. У 2005 годзе такіх аб'ектаў было ўжо 370. Сетка бензакалонак пачынала сваю эвалюцыю нават без навесаў, якія маглі абараніць ад дажджу, не кажучы ўжо пра іншыя выгоды.



Фота Алены ДАЎЖАНОК.

Так выглядае бензакалонка ўнутры. Прыбор, які нагадвае гантэлю, дапамагае вымяраць літраж паліва.

Новы трэнд, якому цяпер усё больш удзяляюць увагу — будаўніцтва аўтаматызаваных АЗС, на якіх аўтамабіліст можа самастойна напоўніць запас паліва ў баку і аплаціць паслугу без удзелу апаратара. Такія запраўкі, напрыклад, добра падыходзяць для вялікіх гарадоў, дзе немагчыма выдзеліць участак зямлі для будаўніцтва тыпавой АЗС.

Усё больш з'яўляецца і газазаправачных станцый. У аўтамабільнага прапана-бутана ёсць вялікія перавагі: экалагічнасць і бюджэтнасць. Калі яшчэ 10 гадоў таму мала хто ведаў, дзе можна заправіцца такім палівам, то цяпер такая магчымасць ёсць на многіх станцыях па ўсёй краіне.

### І ПАЕСЦІ, І ЗАКУПІЦЦА, І... МУЗЫКУ ПАСЛУХАЦЬ

Так званы спадарожны бізнес — крамы і кавярні пры запраўках — ужо, фактычна, перастаў быць дадатковым, і яго доля на некаторых прадпрыемствах складае больш за палову ад усяго прыбытку. Цяпер ніводная АЗС (апроч, хіба што, згаданых вышэй аўтаматызаваных) ужо не будуецца без магазіна. Прычым набыць там можна не толькі аўтамабільныя сродкі і прылады, але і многія спажывецкія ды харчовыя тавары. Ды і кавярні на аўтазапраўках усё часцей уяўляюць сабой не проста «забягалаўкі» з распушчальнай кавай у пластыкавым кубачку, а паўнавартасныя рэстараны, дзе можна замовіць поўны комплексны абед і каву, якую смачна зварыць кваліфікаваны барыста. А ў Гродзенскай вобласці на адной з запраавак і ўвогуле ёсць цалкам дзіцячая кавярня.

Элемент, які, нягледзячы на сваю далікатнасць, займеў на АЗС сур'ёзны падыход, — прыбіральня. Хочаце смейцеся хочаце не, але калі ў недалёкім мінулым яна магла мець выгляд драўлянай «будкі», то сёння гэта камфартабельныя памяшканні (часам нават вынесеныя ў асобны будынак) з усімі неабходнымі прыналежнасцямі, аціпленнем і... музыкай. Прычым туалетныя пакоі на запраўках ёсць не толькі мужчынскія і жаночыя, але і асобныя — для зручнага карыстання людзьмі з інваліднасцю.

### ЭЛЕКТРАМАБІЛІ І «ДАМЫ НА КОЛАХ»

Яшчэ адзін перспектыўны напрамак — развіццё сеткі электразарадных станцый. Пакуль што колькасць зарэгістраваных у Беларусі электрамабіляў не дасягае і сотні, таму асаблівага попыту на такія станцыі няма. Аднак з часам сітуацыя зменіцца. Пакуль што ў нашай краіне ёсць толькі шэсць станцый (адна з іх у Мінску на вуліцы Ляшчынскага), сёлета плануюць усталяваць яшчэ столькі ж, а ў 2020 годзе, цалкам магчыма, на асноўных магістралях праз кожныя 200 кіламетраў ва ўладальнікаў электрамабіляў будзе магчымасць падзарадзіць свой транспарт.

Апошнім часам робіцца запатрабаванымі пляцоўкі для караванінгу, дзе турысты, якія вандруюць у «дамах на колах», могуць спыніцца, зарадзіць акумулятары, наведаць краму, кавярню, пазбавіцца ад адходаў жыццядзейнасці. Цяпер такіх пляцовак сем, а да канца года іх колькасць павялічыцца да 19.

Прыдарожны сэрвіс уключае ў сябе таксама аўтамыйкі і СТА. Але з гэтай тэмай не так усё проста. Сяргей Каморнікаў лічыць гэтую галіну справай прыватнага бізнесу. Аўтамыйкі калі і з'яўляюцца пры станцыях, то яны разлічаны на самаабслугоўванне. Ды і да стварэння СТА трэба падыходзіць з эканамічным разлікам: ці патрэбная пры дарозе станцыя з поўным комплексам рамонтных паслуг, калі аўтамабіліст, хутчэй за ўсё, будзе рамантаваць сваё аўто ў правераным якасным гарадскім аўтасэрвісе? І хоць у Беларусі сустракаюцца на запраўках станцыі, дзе можна прайсці дзяржтэхагляд, але ці запраўды патрэбна там гэта? Альбо можна абысціся толькі шынамантажом і мінімальнымі паслугамі, каб даехаць да больш-менш прыстойнага аўтасэрвісу?

### ЦІ ПАТРЭБНЫ ГАТЭЛІ І ЦІ БУДЗЕ WI-FI?

Што да іншых элементаў прыдарожнага сэрвісу — матэляў, дзіцячых пляцовак, — то яны, часам, таксама сустракаюцца. Але пашыраць іх сетку ў Беларусі немэтазгодна, лічаць спецыялісты. Бо ў нашай краіне не такія вялікія адлегласці, каб была патрэба спыняцца ў прыдарожных гатэлях. Ды і праз кожныя 30 кіламетраў размяшчаецца райцэнтр, дзе ёсць гасцініца і рэстаран. Што да кіроўцаў фур, то яны ніколі не пакінуць свой аўтамабіль нават уначы, бо нясуць адказнасць за груз, які перавозяць.

А што з бясплатным інтэрнэтам на запраўках? Сёння многія АЗС могуць прадастаўляць падключэнне да бясплатнага wi-fi. Але складанасць тут узнікае з боку заканадаўства: любы кліент бесправаднога падключэння павінен быць аўтарызаваны ў сістэме. Такім чынам у кожнага наведвальніка АЗС аператар павінен запатрабаваць пашпарт ці правы кіроўцы, унесці звесткі ў сістэму... Але ўсе разумеюць, што гэта нязручна. Выйсцем можа стаць ідэнтыфікацыя праз мабільны тэлефон, калі дасылаецца SMS, а ў адказ прыходзіць пароль для падключэння да інтэрнэту. Але пакуль што такі спосаб аўтарызацыі каштуе дорага, таму адзіная выйсце па-ранейшаму застаецца ў пакупцы інтэрнэт-карткі «Белтэлекама».

**Дар'я АСІПОВІЧ,**

*г. Гродна*

■

■ Прававая гасцёўня

## КАЛІ МАЁМАСЦЬ АРЫШТАВАЛІ ЗА ДАЎГІ,

### не рэалізоўвайце яе на ўласнае імя

***«Я была вінная грошы банку. Не змагла разлічыцца ў час. Дайшло да канфіскацыі маёмасці. Я пазычыла грошы і набыла яе ва ўласнасць назад. Але калі прыйшла з квітанцыяй, каб вывезці рэчы дахаты, мне паведамілі, што, паколькі ў дакуменце стаіць маё імя, маёмасць мне не вернуць. Цяпер я павінна зноў плаціць за яе грошы, ужо не на сваё імя. Чаму судовыя выканаўцы не папярэджваюць пра такія акалічнасці?»***

**Алена, выпускніца ВНУ,** г.Мінск.



**На пытанне адказвае Андрэй АЎДЗЕЕЎ, галоўны судовы выканаўца Міністэрства юстыцыі Беларусі:**

Калі ў даўжніка арыштоўваюць маёмасць (згодна з артыкулам 510 Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), яму прадастаўляецца права на яе самастойную рэалізацыю пад кантролем судовага выканаўцы. Зразумела, калі чалавек захоча гэта зрабіць і не будзе злоўжываць такім правам, каб адтэрміноўваць продаж маёмасці. Пры гэтым трэба ўлічваць, што рэалізаваць яе ён па законе можа ні ў якім выпадку не сабе, а толькі іншым людзям. Гэта не выкуп, як, напрыклад, у ламбардах, а фактычны продаж у мэтах пагашэння даўгоў. Калі ў даўжніка ёсць грошы (згодна з артыкулам 496 Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь), спагнанне на іх накіроўваецца ў першую чаргу. Калі ж ты не маеш сродкаў, у цябе павінны адбіраць маёмасць для продажу, а атрыманыя ад рэалізацыі грошы трэба накіроўваць на спагнанне даўгоў.

У выніку, калі даўжнік купляе маёмасць на сваё імя, а запазычанасць усё роўна застаецца, маёмасць зноў забяруць, каб спагнаць даўгі. Так што пры рэалізацыі, якая мае на ўвазе адчужэнне маёмасці, трэба рабіць гэта на імя іншай асобы, а не на сваё.

***Шаноўныя чытачы, калі ў вас узніклі пытанні юрыдычнага характару, дасылайце іх на наш паштовы або электронны адрас sidarok@zviazda.by. У «Прававой гасцёўні» разам са спецыялістамі Мінюста мы будзем шукаць на іх адказы***

■

■ Занятасць

# ЗАПРАШАЕМ ПРАДАЎЦОЎ ЛАТАРЭЕК І ПІВА!

## Як праходзіў кірмаш вакансій

**«Возьмем работніка з вопытам не менш за тры гады». «Пенсіянерам нічога прапанаваць не можам». «Працавалі ў іншай сферы? Не падыходзіце». Што яшчэ кажуць сённяшнія наймальнікі? Патрабаванні працадаўцаў і запыты саіскальнікаў мы вывучалі на сталічным кірмашы вакансій.**



Фота Надзеі БУЖАН.

### Рабочым — па тры мільёны

Кажуць, на гандлі крызіс не адбіўся. Пытаемся пра вакансіі ў кадравікоў адной з гандлёвых сетак.

— Нам цяпер патрэбны прадаўцы, бухгалтары, таваразнаўцы, кухары, — пералічвае прадстаўніца кампаніі «Белмаркет». — Заробкі розныя. Кантралёру-касіру абяцаем ад 3,5 да 5 мільёнаў. Калі ў буйной краме працаваць будзе, то і болей. Абвальшчыку можам прапанаваць 6 мільёнаў у месяц.

Саіскальнікі, што сабраліся вакол стала кампаніі, слухаюць і, каб не ўпусціць свой шанц, анкеты запаўняюць. За паўгадзіны гандлёвай сетцы пакінулі больш за 20 рэзюме.

— А на склад не патрэбен чалавек? — цікавіцца малады мужчына. — Я грузчыкам пайсці магу.

Не, чуе ў адказ, у такіх работніках неабходнасці няма.

— Усе хочуць працаваць рабочымі, — заўважае кадравік Мінскага падшыпнікавага завода. — А нам патрэбны спецыялісты!

Прапаноў для некваліфікаванай працоўнай сілы сапраўды мала. А тыя, што ёсць, не самыя прывабныя. Напрыклад, гатэль «Мінск« запрашае грузчыка, кухоннага рабочага і прыбіральшчыка вытворчых памяшканняў. Заробкі ў раёне трох мільёнаў. Мінскводаканал гатовы плаціць рабочым 2,8-3,5 мільёна.

**Каб за працу заплацілі, напрыклад, тры мільёны, неабходна збыць больш за 830 латарэйных квіткоў. З кастрычніка па сакавік, кажуць, рэалізацыя ідзе на «ўра«. А ў дачны сезон — спад.**

— Вы сур'ёзна? — абураецца мужчына. — Хто ж за такія грошы ў Мінску працаваць будзе?

— За некваліфікаваную працу больш заплаціць не можам. А вось у спецыялістаў зусім іншыя заробкі, — прадстаўніца прадпрыемства паказвае спіс вакансій з прапановамі ў 7 мільёнаў.

### У сядзелкі не ідуць

Дысбаланс попыту і прапановы, пра які ўжо не першы месяц сведчыць статыстыка, заўважны і на кірмашы. Ля сталоў будаўнічых кампаній — процьма мужчын. А вакансій для іх няма.

— Шчыра? Нічога прапанаваць пакуль не можам. Самі ведаеце, які спад у будаўніцтве. Некаторых кандыдатаў толькі для сябе пазначаем, раптам спатрэбяцца рукі, — прызнаюцца ў адным з будаўнічых трэстаў.

Іншая кампанія тлумачыць саіскальніку, што працу будаўніком лепш шукаць менавіта на будоўлі: «Вось вы хто па спецыяльнасці, муляр? Разумееце, муляры па адным не патрэбны. Наймаюць брыгаду. Пахадзіце па аб'ектах, спытайце ў брыгадзіраў, ці гатовы яны вас прынязць».

**• Афіцыйна**

**Андрэй ЛАБОВІЧ, першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:**

— Кірмаш вакансій — гэта рэгулярнае мерапрыемства, якое праводзіцца два разы на год, як правіла, вясной і ўвосень. І, як бачым, яно карыстаецца попытам у нашых грамадзян, што шукаюць працу і маюць патрэбу ў кансультацыі па пытаннях уладкавання. На сённяшнім кірмашы прадстаўлена больш за 80 арганізацый, якім неабходны работнікі. Гэта як бюджэтныя ўстановы, так і рэальны сектар эканомікі. Задача такіх мерапрыемстваў і дзяржаўнай службы занятасці ў цэлым — звесці саіскальніка і наймальніка, задаволіць патрэбы абодвух бакоў.

Ля кадравікоў паліклінік і бальніц, дзе, наадварот, назіраецца недахоп персаналу, чэргі не збіраюцца. Мала хто цікавіцца вакансіямі раённых упраўленняў адукацыі, спорту і турызму. Спецыялісты ўпраўленняў шукаюць работнікаў для дзіцячых садкоў: выхавальнікаў, псіхолагаў, выкладчыкаў фізкультуры і музыкі. Тэрытарыяльныя цэнтры сацдапамогі насельніцтву попытам з боку саіскальнікаў таксама не карыстаюцца. Праца адказная, а заробкі нізкія: сацыяльнаму работніку і сядзелцы прапануюць па 3,2 мільёна. Пры ўмове занятасці на цэлую стаўку.

### 160 рэзюме на вакансію бухгалтара

Газеты з вакансіямі на кірмашы расхопліваюць вельмі хутка. Праўда, у пошуку працы гэта інфармацыя наўрад ці дапаможа. «Пакуль газета надрукуецца, наймальнік ужо паспее знайсці супрацоўніка. Рабочая вакансія закрываецца за дзве гадзіны!» — тлумачыць кадравік прадпрыемства «Прамсувязь». На самім заводзе па вытворчасці апаратуры сувязі ўсяго пару свабодных месцаў: інжынер-канструктар, дзе патрэбна вузкая спецыяльнасць, і галоўны бухгалтар. На апошняе, упэўнены на прадпрыемстве, яны хутка падбяруць работніка. На вакансію з заробкам у 13 мільёнаў у інтэрнэце ўжо пакінулі 160 рэзюме.

Аўтобусны парк №6 шукае кухара (у месяц абяцаюць 6 мільёнаў), буфетчыка і кандытара (заробкі па 4,5 мільёна). Кіроўцы не патрэбны: усё ўкамплектавана.

— Кухара хочам 5-га разраду. Ну, не менш за чацвёрты дакладна, — каментуе **спецыяліст аддзела кадраў парка Наталля ГРЫГАРКЕВІЧ.** — Патрабаванні да буфетчыка? Вопыт працы або сярэдняя спецыяльная адукацыя. Графік работы — з 5 раніцы да 14 гадзін. Персанал на працу падвозіць дзяжурны аўтобус.

Але дзяўчат (відаць, нядаўніх выпускніц), якія спачатку зацікавіліся вакансіямі, інфармацыя пра арганізаваны падвоз не надта суцешыла.

— Ты падлічы, колькі часу яшчэ пойдзе, каб сабрацца і даехаць да парка. У тры ночы ўжо трэба быць на нагах! — перагаворваюцца між сабой прыяцелькі.

### Усюды трэба «пахаць»

Блукаем між стэндаў кампаній. «Элема» чакае садоўніка і швачку, «Амкадор» — слесара і электразваршчыка, Мінскі завод будаўнічых матэрыялаў — машыніста бульдозера і начальніка аддзела маркетынгу. Уладкавацца паштальёнам за 3,5 мільёна прапануе «Белпошта».

— Ты добра падумай, кіпы газет цяжка насіць будзе, — адгаворвае дачка сваю маці-пенсіянерку.

— А дзе цяпер лёгка? Усюды трэба «пахаць», — тая хоць заўтра гатова дастаўляць па пад'ездах лісты і прэсу.

Месца побач з домам прапануюць «Беларускія латарэі». «Вам у якім раёне зручней будзе?» — цікавяцца ў мяне. Ахвотнікаў «прадаваць удачу» назбіралася ўжо з дзясятак чалавек. У асноўным пенсіянеркі. Фіксаванага заробку гэта пасада не прадугледжвае. Будзеш атрымліваць 12 працэнтаў ад выручкі. Хтосьці па паўтара мільёна ў месяц мае, іншым удаецца па 4-5 мільёнаў зарабіць. Мы падлічылі: каб за працу заплацілі, напрыклад, тры мільёны, неабходна збыць больш за 830 латарэйных квіткоў. З кастрычніка па сакавік, кажуць, рэалізацыя ідзе на «ўра». А ў дачны сезон — спад. Таму цяпер на латарэйках не разжывешся.

Затое на лета можна ўладкавацца прадаўцом піва. Завод «Крыніца» якраз запрашае гандляваць у свой павільён на перыяд з мая па кастрычнік. Графік — з 11 да 19 гадзін. Заробак — па выніках гутаркі.

### Праца на галаву не зваліцца

На кірмашы былі прадстаўлены таксама сацыяльныя прадпрыемствы. Інвалідам з працоўнай групай прапаноўвалі месцы на заводзе асвятляльных прыбораў, швейнай фабрыцы па вытворчасці спецадзення. Прадпрыемства, дзе выпускаюць мюслі і галеты, абяцала ўладкаваць укладчыкам, упакоўшчыкам ці падсобным рабочым.

Тыя, хто хоча адкрыць сваю справу, маглі пракансультавацца ў спецыялістаў. **Начальнік аддзела аналізу і рэгулявання рынку працы ўпраўлення занятасці насельніцтва профільнага камітэта Мінгарвыканкама Святлана ЛЯВОНЧЫК** кажа, што самы папулярны від дзейнасці сярод прадпрымальнікаў з ліку былых беспрацоўных — будаўніча-мантажныя работы. Многія выбіраюць гандаль і транспартныя паслугі.

**Дысбаланс попыту і прапановы, пра які сведчыць статыстыка, заўважны і на кірмашы. Ля сталоў будаўнічых кампаній — процьма мужчын. А вакансій для іх няма.**

— Міжнародныя перавозкі — прыбытковы бізнес. Гэта адзін з нямногіх напрамкаў, дзе за мінулы год ёсць прырост экспарту паслуг, — запэўнівае **Генадзь ДАШКЕВІЧ, дырэктар вучэбнай установы «БАМАП-ВЕДЫ»**, на базе якой працуе цэнтр падтрымкі прадпрымальніцтва. — 95 працэнтаў арганізацый у сістэме перавозак — прыватнікі. Таму кіроўцам катэгорыі В, D мы прапануем адкрыць свой бізнес і аказваць паслугі маршрутнага таксі.

Дапамогу ва ўладкаванні прапаноўвалі і інтэрнэт-рэсурсы па пошуку працы. Наведвальнікам кірмашу раздавалі міні-анкеты, дзе неабходна было пазначыць толькі свае кантакты і жаданую пасаду, а спецыялісты сайтаў ужо самастойна раскідалі б гэтую інфармацыю па наймальніках. Саіскальнікі на ўсялякі выпадак паперкі запаўнялі. Бо, як абвяшчаў дэвіз аднаго з рэсурсаў, «не чакай, што праца зваліцца на галаву».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■

## Кацярына ДУБІНСКАЯ:

# «ЛЮБІЦЕ ПРАФЕСІЮ Ў САБЕ, А НЕ НААДВАРОТ»



**За 15 гадоў існавання агенцтва «Мінск-Навіны» вырасла ў актыўны медыярэсурс, які аб'яднаў пяць сродкаў масавай інфармацыі — дзве газеты, дзіцячы часопіс, радыё і інтэрнэт-партал. У сучасных умовах менш за ўсё пытанняў выклікае, пэўна, запатрабаванасць інтэрнэт-партала. Цікава, а якім павінна быць сёння гарадское FM-радыё, каб заставацца канкурэнтаздольным? А гарадскія газеты — каб іх чыталі нароўні з рэспубліканскімі? Думаецца, тут, як мінімум, не варта баяцца абнаўлення, эксклюзіўных праектаў. Свежае, цікавае і прафесійна зробленае абавязкова заўважаецца, у чым не раз пераконвалася генеральны дырэктар агенцтва Кацярына ДУБІНСКАЯ, якая падзялілася некаторымі навінамі.**

***— Шчыра віншую, Кацярына Эдуардаўна, з "паўкруглай" датай, і дазвольце адразу пацікавіцца: будзеце святкаваць ці проста падсумуеце вынікі, каб ведаць, у якім кірунку рухацца далей?***

— Пэўна, трэба святкаваць, хоць дата і не круглая. Заўсёды карысна падтрымаць баявы дух, прыўзняць калектыў над рэчаіснасцю. Таму і прапаную калектыву 4 мая, напярэдадні Дня друку і Дня радыё (абодва прафесійныя святы маюць да нас дачыненне), сабрацца на ўрачыстае ўзнагароджанне ў Белай зале храма-помніка ў гонар Усіх Святых. Дзякуй протаіерэю Фёдару Поўнаму за прадастаўленую магчымасць... У вельмі прыгожай зале каля 40 журналістаў атрымаюць узнагароды ад гарадской улады, гарадскіх службаў. А адзін з нашых верных сяброў — Вялікі тэатр оперы і балета — падрыхтаваў да гэтага свята канцэртную праграму.

***— Думаю, калектыў гэта цалкам заслужыў! А ўсё ж такі... якіх менавіта журналістаў трэба заахвочваць і падтрымліваць?***

— Тых, хто любіць прафесію у сабе, а не сябе ў прафесіі. Тут мае думкі сугучныя з меркаваннямі Ксеніі Сабчак, якія даваўлося пачуць падчас яе нядаўняй сустрэчы з беларускай публікай... Ксенія сказала, што дасягнуць чагосьці ў нейкай справе магчыма, толькі калі вельмі любіш гэту справу. Гэта значыць, трэба быць шчырым з самім сабой, калі адказваеш на пытанне «А што я магу даць у дадзеным выпадку?». Тады пачынаеш разумець, што трэба шмат і ўпарта працаваць. У выпадку з агенцтвам мы ад самага пачатку разважалі над тым, што можам даць гораду. І сёння бачым, што нямала. У нас пяць розных СМІ, і ўсе маюць свайго адрасата. З дапамогай аналітычнага цэнтра ECOOM правялі сацыялагічнае апытанне і высветлілі, што чытацкая аўдыторыя «Вечернего Минска» — каля 360 тысяч чалавек, зацікаўленых у тым, каб горад развіваўся, «Минский курьер» чытаюць усе, хто прымае рашэнні і адказвае за іх выкананне, аўдыторыя «Радио-Минск» — моладзь, адукаваная і прасунутая (вяшчанне ажыццяўляецца не толькі ў Мінску, але і Віцебску, Магілёве, Гомелі і Брэсце), часопіс «Качели» — для крэатыўных дзяцей. Агенцтва «Мінск-Навіны» выйшла ўжо на рэспубліканскі ўзровень, нас цытуюць і тэлеканалы, і прэса. На канале АНТ па серадах ідуць нашы выпускі «Агенцтва «Мінск-Навіны» прадстаўляе». Наогул інтэрнэт-партал minsknews.by — гэта 30-35 навін штодня, і, каб забяспечыць іх, журналісты працуюць без выхадных: звычайна «ў палях» у любы дзень чалавек 7-8, якія не прапускаюць цікавых мерапрыемстваў, у тым ліку з удзелам кіраўніцтва горада. Цягам месяца сайт наведвае каля 120 тысяч карыстальнікаў, сярод якіх прадстаўнікі розных краін свету.

***— Якімі праектамі здзіўляеце цяпер?***

— Мы столькі ўжо ўсяго прыдумлялі, што ад нас пастаянна чакаюць сюрпрызаў. Па праўдзе сказаць, здзіўляць усё цяжэй. Нядаўна ў «Минском курьере» завяршыўся сумесны праект з удзелам камітэта аховы здароўя Мінгарвыканкама «Здравствуйте, доктор!», прысвечаны маладым сталічным урачам, і на змену яму прыйшла рубрыка «Галоўны ўрач», у якой кіраўнікі ўстаноў аховы здароўя расказваюць пра сябе, пра ахову здароўя... У Год культуры вырашылі распачаць і такія праекты, як «АртэФакты», «Арт-асяроддзе», «Класікі жанру». У «Вечернем Минске» стартавалі «Год культуры ў тварах» і «Культурны код». Акрамя таго, лічым карысным трымаць у тонусе раённыя адміністрацыі — вырашылі прадстаўляць два раёны з адной праблемай. Журналіст высвятляе, напрыклад, дзе больш чыста...

***— Летась быў падпісаны дакумент аб партнёрстве з «Вечерней Москвой»...***

— Пакуль наша партнёрства носіць эпізадычны характар і прымяркоўваецца да нейкіх значных падзей. Аднак ужо з наступнага года з пэўнай перыядычнасцю «Вячорка» будзе прадстаўляць свае навіны ў маскоўскім выданні, а «Вечерняя Москва» — у нашым. Дарэчы, абедзве газеты распаўсюджваюцца бясплатна ў метрапалітэне, праўда, па рознай схеме. Там газету раздаюць маладыя людзі на выхадзе, а мы ўлічылі ўсе меры бяспекі — развозім і выкладваем газету па начах.

***— А якімі былі першыя вашы крокі ў агенцтве, з чаго вы пачыналі?***

— Я прыйшла на гэту пасаду 8 гадоў таму, і на той момант пазіцыя агенцтва была не такой моцнай, як у самым пачатку, 15 гадоў таму. На той момант у складзе холдынга было нават «Сталічнае тэлебачанне»... Цяжка было паверыць, што даволі хутка пачнём атрымліваць вышэйшыя прафесійныя ўзнагароды, трапім у лік найлепшых прадстаўнікоў СМІ краіны. Спачатку даводзілася заняцца «Минским курьером», потым дадаўся дзіцячы часопіс «Качели». Пазней прывялі ў парадак радыё, якое, па неафіцыйных звестак, займае сёння 7-е месца па папулярнасці сярод больш як 20-ці станцый. Можа быць, гэта таму, што мы выбралі ў якасці прыярытэту не папсу, а стары/новы добры рок, плюс інфармацыю пра жыццё сталіцы ў рэжыме анлайн. «Вечерний Минск» далучаўся вельмі складана — па першым часе выходзіў паралельна з «Кур'ерам», так што ў нечым атрымліваўся дубляж. Але потым нарадзілася ідэя стварыць бясплатную масавую газету. Такая практыка існуе ў шэрагу сталіц свету. А мы, як высветлілася, ішлі паралельна з «Вечерней Москвой», дзе побач з дзённым выпускам пачаў выходзіць вячэрні бясплатны. Мы захоўваем магчымасць падпіскі, але кожную раніцу ў чацвер можна ўзяць нашу "Вячорку" ў метро... Спецыяльная служба забірае газету з друку, развозіць дзесьці з 01.00 да 04.00 і запаўняе спецыяльныя стойкі на выхадзе з метрапалітэна. Але з нядаўняга часу мы распаўсюджваем такім чынам толькі палову накладу, другая адпраўляецца на буйныя прадпрыемствы, ва ўстановы аховы здароўя і культуры, у гасцініцы, аквапарк, студэнцкую вёску, аэрапорт, што немалаважна для нашых рэкламадаўцаў. Каб наладзіць увесь гэты працэс, давялося папрацаваць. Адразу скажу, што газету разбіраюць не для бытавых патрэб, а сапраўды чытаюць. Бо пасля кожнага выхаду ў рэдакцыю паступае шквал званкоў і лістоў.

> **«Ні ў электронных, ні ў друкаваных СМІ няма будучыні, калі яны нецікавыя»**

***— Што вы лічыце праблемай для сучаснай журналістыкі?***

— Кадры, і толькі. Тая ж Ксенія Сабчак пазіцыяніруе сябе ў першую чаргу як журналістка. Таму не дзіва, што, калі ў яе запыталі: "як трапіць да вас на працу?", яна спынілася на праблеме кадраў. Маўляў, у той жа Маскве ёсць, умоўна кажучы, дзесяць тысяч журналістаў, якія нядрэнна пішуць, але толькі адзінкі пішуць так, што хочацца чытаць. Бо гэта аўтарскія погляды на рэчы. Ксенія сказала, што гатовая адсочваць нават газету "Гудок", каб разглядзець там патэнцыял такога аўтара, перацягнуць да сябе і выгадаваць сапраўднага майстра...

***— Маладыя журналісты апрыёры не з'яўляюцца тымі, у каго ёсць свой, аўтарскі, погляд?***

— Няхай не крыўдзіцца наш маладняк, але «залатое пяро» сёння трывала трымаюць тыя, хто працуе ў нас якраз 15 гадоў. Яны пішуць «з галавой», у іх кругагляд, ім цікавы не толькі прадмет сваіх артыкулаў, а жыццё ў прынцыпе. Аляксандр Філіповіч не проста лепш за ўсіх піша пра жыллёва-камунальную гаспадарку. Ён таму так выдатна і піша, што добра ведае літаратуру і яшчэ шмат чаго!

Калі хочаце сапсаваць настрой галоўнаму рэдактару "Вечерней Москвы" Аляксандру Купрыянаву, загаварыце з ім пра маладыя кадры. Аляксандр Іванавіч любіць на планёрках, якія адбываюцца там цягам дня, спыніць абмеркаванне рабочых момантаў і спытаць, скажам, у 27-гадовай журналісткі (у якой, між іншым, універсітэт за плячыма!): а хто такі... Эдуард Лімонаў? Агучваецца шмат цікавых версій... Безумоўна, ёсць і будуць у журналістыцы такія, хто чытае толькі сябе і старанна апісвае тое, што бачыць. Тым не менш будуць і такія журналісты, ад слоў якіх дух захоплівае.

***— У друкаваных СМІ ёсць будучыня?***

— Ні ў электронных, ні ў друкаваных СМІ няма будучыні, калі яны нецікавыя. Як жа выдатна напісаў, напрыклад, наш Сяргей Пятровіч Пяткоўскі пра лаўкі, якіх, напэўна, хутка пазбавяцца нашы двары. Самі бабулі, якія раней любілі пасядзець каля дома, пачалі настойваць на такіх зменах, каб толькі пад вокнамі перасталі збірацца шумныя кампаніі... Развагі вакол такіх жывых тэм трэба чытаць не на электронных носьбітах, а гартаючы старонкі, каб адчуваць і бачыць, як папрацавала каманда прафесіяналаў над падачай! А гаджэты добрыя, каб прабегчыся па навінах, максімум, што там можна асіліць — блог.

Як бы там ні было, друкаваныя газеты актыўна чытаюць і ў Італіі, Бельгіі, Аўстрыі, Турцыі, Японіі... Вельмі многія еўрапейскія сталіцы выпускаюць бясплатную газету, а тое і дзве. І іх чытаюць — сама бачыла! Аднак што на самой справе будзе далей, прадказаць цяжка. Некалькі гадоў таму сапраўды друкаваныя версіі пачалі страчваць сваю папулярнасць, а цяпер раптам вярнуліся. У любым выпадку прафесіяналізм журналіста будзе мець вырашальнае слова — хоць у папяровым, хоць у электронным варыянце.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

---

Даты | Падзеі | Людзі

**3 МАЯ**

**1791** год — 225 гадоў таму Вялікі сейм Рэчы Паспалітай прыняў новую канстытуцыю, закліканую садзейнічаць палітычнаму і эканамічнаму развіццю краіны. Канстытуцыя абвясціла суверэнітэт Рэчы Паспалітай як унітарнай дзяржавы, ліквідавала падзел на Карону і ВКЛ. У ВКЛ пры гэтым захавалася асобнае судаводства, свая казна, прадугледжвалася роўнае прадстаўніцтва Кароны і ВКЛ у сейме і яго камісіях. Месцам правядзення сеймаў была вызначана Варшава, раз на тры гады — Гродна. Грамадзянскія свабоды распаўсюджваліся на шляхту, духавенства, чыноўнікаў. Жыхары дзяржаўных гарадоў атрымалі права на асабістую недатыкальнасць, права набываць зямлю, шляхецтва, займаць ніжнія адміністрацыйна-судовыя і царкоўныя пасады. Абвешчана свабода веравызнання з захаваннем дзяржаўнага статусу каталіцтва. Дэкларавалася апека закона і ўрада над феадальна-залежнымі сялянамі. Заканадаўчая ўлада перадаздзена двухпалатнаму сейму, выканаўчая — каралю і Радзе з 6 міністраў, падсправаздачных сейму. Міністраў прызначаў кароль. Ліквідаваліся правы ліберум вета, усе пастановы сейма павінны былі прымацца большасцю галасоў. Уводзілася спадчыннасць трона. Канстытуцыя была адменена ў 1793 г. у выніку другога падзелу Рэчы Паспалітай. Яна была першым у Еўропе і другім у свеце (пасля Канстытуцыі ЗША) асноўным законам, зафіксаваным у пісьмовым выглядзе.

**1904** год — амерыканскі вынаходнік Джордж Паркер запатэнтаваў сваю першую пісьмовую ручку з механічнай сістэмай набору чарніла.



**1951** год — нарадзілася Вольга Сяргееўна Шымава, беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук, прафесар, заслужаны работнік адукацыі Беларусі. У 1973 годзе скончыла Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт. Аўтар навуковых прац па праблемах эколага-эканамічнага рэгулявання, кіравання экалагічнай бяспекай, удасканалення эканамічных метадаў кіравання прыродаахоўнай дзейнасцю.

**Было сказана**

**Георгій МАРЧУК, пісьменнік:**
*«У генія ёсць адна асаблівая здольнасць — знаходзіць творчасць ва ўсім».*

---

# ІМІ ВАРТА ГАНАРЫЦЦА

## Напярэдадні Дня працы ў Магілёве абнавілі Дошку гонару

**Для лаўрэатаў спецыяльнай прэміі «Чалавек года» і лідараў сярод прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў вобласці па выніках працы за мінулы год грымела ўрачыстая музыка, спявалі песні, у іх адрас гучалі пранікнёныя словы.**


Фота БЕЛТА.

— Нездарма кажуць: чалавек працай слаўны. Мы прыносім словы ўдзячнасці тым, хто праслаўляе Магілёўскую зямлю, — адзначыў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ.** —У нас ёсць добрыя працоўныя калектывы, вядомыя далёка за межамі вобласці і краіны. За першы квартал гэтага года нашы прадпрыемствы асвоілі 9 новых рынкаў; прадукцыя, якая туды пастаўляецца, мае добры попыт у спажыўцоў. Нашы людзі ведаюць, як трэба працаваць і што вырабляць. Размова ідзе не толькі пра вытворцаў рэальнага сектара эканомікі, але і пра найлепшых прадстаўнікоў медыцыны, культуры, адукацыі, спорту. Дзякуй за вашу працу, бо менавіта ад гэтага залежыць сацыяльна-эканамічнае развіццё вобласці і наш бюджэт.

Сярод тых, хто атрымаў ганаровае званне «Чалавек года», Мікалай Барулін, кандыдат сельскагаспадарчых навук, дацэнт, загадчык кафедры іхтыялогіі і рыбаводства Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі.

— Гэта перш за ўсё адзнака майго калектыву, — сціпла адзначыў ён. — Тут улічвалася і навуковая праца, і стварэнне рыбагадавальніка па гадоўлі вясёлкавай фарэлі, іншыя складнікі. Высокія вынікі, паўтаруся, дасягнуты сумеснымі намаганнямі.

На Дошку гонару занесена 15 прозвішчаў самых лепшых па працы і 24 назвы арганізацый, устаноў і прадпрыемстваў. У ліку перадавых калектываў Магілёўскі філіял рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства паштовай сувязі «Белпошта» пад кіраўніцтвам Алены Котавай, абласная дзіцячая бальніца, якой кіруе галоўны ўрач Ігар Каско (ён жа чалавек года), інфармацыйнае агенцтва «Магілёўскія ведамасці» на чале з галоўным рэдактарам Святланай Шутавай.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# РЭСТАЎРАЦЫЯ: РАМЯСТВО ЦІ МАСТАЦТВА

## У любым выпадку, гэтай адказнай справай павінны займацца толькі прафесіяналы

**Рэстаўрацыя — нібы імунная сістэма ў целе культуры. Без яе арганізму, што сутыкаецца з рознымі выпрабаваннямі, проста не выжыць. Гістарычныя помнікі, створаныя стагоддзі таму, нават ад подыху няўмольнага часу губляюць сваю першапачатковую моц і веліч. Захаваць хараство, не змяняючы яго, дапамагчы яму заззяць новымі фарбамі здольныя менавіта рэстаўратары. Ашчадна дакранаючыся да цела помніка культуры, пранікаючы ў яго ўнутраную сістэму, яны наладжваюць усё так, каб ён праслужыў яшчэ як мінімум стагоддзе.**

**Галоўная арганізацыя ў нашай краіне, якая займаецца гэтай справай, — «Белрэстаўрацыя». Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з яе генеральным дырэктарам Уладзімірам ЗМУШКАМ, каб даведацца, чым сёння жыве гэта сфера.**



***— Уладзімір Леанідавіч, вы выступілі з ініцыятывай стварэння рэстаўрацыйнага савета. Нядаўна прадстаўнікі Міністэрства культуры паведамілі, што прынята рашэнне ідэю падтрымаць. На вашу думку, што ён будзе сабой уяўляць?***

— Я мяркую, што савет дасць магчымасць адсячы некампетэнтныя арганізацыі ад сферы рэстаўрацыйных работ. На сённяшні дзень цалкам адпавядае ўсім крытэрыям па правядзенні такіх работ толькі адна арганізацыя — «Белрэстаўрацыя», у якой ёсць дасведчаныя, атэставаныя спецыялісты і неабходная матэрыяльна-тэхнічная база. Стварэнне такога савета дапаможа змяніць сітуацыю: на сённяшні дзень, нагадаю, мы адзіная краіна сярод нашых суседзяў, дзе гэты від дзейнасці не сертыфікуецца і не ліцэнзуецца. Значыць, рэстаўрацыю можа праводзіць любая арганізацыя, якая мае юрыдычны статус (у тым ліку будаўнічая. — **Аўт.**). Акрамя таго, рэстаўрацыйны савет будзе выдаваць сваё заключэнне на праектна-даследчыя работы, якія, натуральна, павінны папярэднічаць вытворчасці. Часта бывае, што праекціроўшчыкі не бяруць пад увагу многія гістарычныя ўмовы і дапускаюць памылкі пры праектаванні, што прыводзіць да знікнення пэўных адметнасцяў аб'екта. І яшчэ адзін напрамак дзейнасці — пацвярджэнне кваліфікацыі спецыялістаў-рэстаўратараў. Напрыклад, мастак, які скончыў вучылішча, прайшоў вытворчую практыку і ўжо мае пэўны кваліфікацыйны ўзровень, натуральна, захоча ўдасканальвацца ў сваёй сферы — савет зможа пацвердзіць яго кваліфікацыю.

***— Якія эксперты ўвойдуць у новую арганізацыю?***

— Пры Міністэрстве культуры ёсць навукова-метадычная рада, якая існуе ўжо не адзін год. Я думаю, праз яе будзе адбывацца ўзгадненне кандыдатур гэтых спецыялістаў. Акрамя таго, можна далучыць да справы Беларускі саюз мастакоў.

***— Наколькі рэальна стварэнне савета змяніць сітуацыю?***

— Натуральна, заўсёды імкнешся, каб усё атрымалася так, як задумана. Пацвярджэнне кваліфікацыі спецыялістаў цяжкасцяў не выкліча. А вось зрабіць аналіз арганізацыі ў цэлым і яе вытворча-тэхнічнага стану будзе складана. Бо сертыфікаты (ліцэнзіі, як гэта раней называлася) будаўнічым фірмам выдае «Белбудліцэнзія», што падпарадкоўваецца Міністэрству архітэктуры і будаўніцтва. Менавіта яны вырашаюць, мае пэўная фірма права займацца будаўнічымі работамі або не. А ў «Белрэстаўрацыі» працуюць людзі ў асноўным творчыя, таму правесці аналіз цэлых фірмаў на прадмет матэрыяльна-тэхнічнага абсталявання і адпаведнасці патрабаванням будзе складана. Таму трэба падумаць, з кім супрацоўнічаць у гэтым пытанні: магчыма, давядзецца звяртацца ў тую ж «Белбудліцэнзію».

**У Лошыцкай сядзібе ў найлепшым выглядзе адлюстраваны ўсе віды рэстаўрацыйных работ: пачынаючы ад вулічнага адстройвання сцен і фундаментаў, заканчваючы насценнымі роспісамі ўнутры будынка.**

***— На сённяшні дзень абсалютна ўсе будаўнічыя фірмы могуць займацца рэстаўрацыяй?***

— Іх спецыялісты лічаць, што раз яны будаўнікі, то і ў рэстаўрацыі нічога складанага для іх няма. Наждаком пацёр, шчоткай паскроб, шпаталем пачысціў — вось табе і ўся рэстаўрацыя. Аднак гэта насамрэч не так. Па знакавых аб'ектах, на якіх цяпер вядуцца работы, — на галоўным фасадзе «Беларусьфільма» і на надтрыбуннай чашы на сталічным стадыёне Дынама — ёсць дакладнае распараджэнне гарадскіх улад, каб там працавалі толькі спецыялісты «Белрэстаўрацыі». Людзі справы добра разумеюць, што іншыя арганізацыі гэту работу так, як трэба, не выканаюць.

***— Часам неабдуманымі дзеяннямі нашым помнікам наносіцца досыць значны ўрон...***

— Не буду даваць ацэнак. Прывяду толькі адзін прыклад — Лідскі замак. Мы на тым аб'екце зусім не былі — работы выконваў будаўнічы трэст. Яны рабілі, як умелі і як прызвычаіліся. Я пацікавіўся і высветліў, што там насамрэч аднаўленне праводзілася проста жудасна, без прымянення класічных рэстаўрацыйных тэхналогій па аднаўленні цаглянага мура сцен і скляпенняў. Таму атрымаўся такі сумны вынік.

***— Якія знакавыя аб'екты адрэстаўравала ваша арганізацыя?***

— Мірскі замак, работы на якім былі распачаты яшчэ ў 1984 годзе. Паспяхова здалі яго мы ў 2010 годзе. За гэты аб'ект нават атрымалі грамату як найлепшае рэстаўрацыйнае прадпрыемства ў Беларусі. Ад аднаўлення сцен і цаглянай кладкі і да інтэр'ераў — над усім шчыравалі нашы спецыялісты. Толькі некаторыя прадметы мэблі рабілі на беларускіх прадпрыемствах, у прыватнасці на Бабруйскім дрэваапрацоўчым заводзе. У багата аздобленай партрэтнай зале пазалоту, лепку таксама мы выконвалі. Ва ўсім сваім бляску рэстаўрацыя была паказана ў Нясвіжскім палацы. Сталярныя вырабы (дзверы, вокны) рэстаўрацыю драўляных элементаў сценавых панэляў, столяў, усю дэкаратыўна-гіпсавую лепку, аднаўленне печаў, камінаў, жывапіс, пазалоту ўнутры і звонку будынка рабілі мы.



Адноўлены дэкаратыўны металічны элемент.

**У мастацка-рэстаўрацыйных майстэрнях, якія знаходзяцца ў сталіцы на Чачэрына, 3б, сабрана творчая эліта — мастакі-рэстаўратары, скульптары, пазалотчыкі, бляхары (здольныя аднаўляць часткі крыжоў, страчаныя элементы скульптур). Там размяшчаецца і асноўная вытворчая база па гіпсе, а таксама працуюць высокакваліфікаваныя мастакі-рэзчыкі, якія аднаўляюць мэблю.**

***— Якім аб'ектам беларускія рэстаўратары найбольш ганарацца?***

— Гэта Лошыцкая сядзіба, што знаходзіцца ў адным са сталічных паркаў, — яна даволі кампактная, але з'яўляецца сапраўднай пярлінай. Там у найлепшым выглядзе адлюстраваны ўсе віды рэстаўрацыйных работ, пачынаючы ад вулічнага адстройвання сцен і фундаментаў, заканчваючы насценнымі роспісамі ўнутры будынка. У сядзібе можна ўбачыць поўны набор усіх відаў рэстаўрацыйнай дзейнасці.

***— Не так даўно былі знойдзены ўнікальныя фрэскі на знешнім фасадзе касцёла Божага цела ў Нясвіжы. Іх аднаўленнем таксама займаецца ваша арганізацыя?..***

— Сапраўды, некалькі месяцаў таму ў выніку зандажоў, праведзеных на фасадзе касцёла Божага цела, пад слоем тынкоўкі былі знойдзены мастацкія роспісы сцен. Па сцвярджэнні нашых мастакоў-рэстаўратараў, яны адзіныя, што ў такой колькасці, аб'ёме, квадратуры прадстаўлены ў Беларусі. Паводле папярэдніх звестак, усе сцены будынка касцёла пакрыты мастацкім роспісам. Іх трэба адкрываць, апрацоўваць, кансерваваць, аднаўляць.

***— Як будзе праходзіць іх аднаўленне?***

— Спачатку мастацкая кампазіцыя на сцяне адкрываецца, праводзіцца яе аналіз, замацаванне. Часткі, якія былі страчаны, узнаўляюць мастакі-рэстаўратары: робяць на ўзор таго, што было 200—300 гадоў таму. Такім чынам, і тыя выявы, што былі знойдзены, захоўваюцца, і на месцы прабелаў ствараюцца кампаненты, якіх не хапае.

***— Атрымліваецца, у нас ёсць спецыялісты, здольныя выконваць работы такога ўзроўню?***

— Безумоўна. Іх няшмат, і яны ўжо досыць сталага веку. Аднак і моладзь далучаецца. У нас ёсць ужо пяць-сем маладых мастакоў-рэстаўратараў па роспісе. Дарэчы, такім жа метадам быў адноўлены насценны роспіс у будынку Камяніцы ў Нясвіжскім палацава-паркавым комплексе.

**Наждаком пацёр, шчоткай паскроб, шпаталем пачысціў — вось табе і ўся рэстаўрацыя. Аднак гэта насамрэч не так.**

***— На вашу думку, ці захавалася беларуская рэстаўрацыйная школа? Або штосьці было страчана?***

— Па-першае, дзякуй Богу, працуюць навучальныя ўстановы, з якіх выходзяць спецыялісты-рэстаўратары. Гэта, напрыклад, рэстаўрацыйнае вучылішча ў мястэчку Мір. Таксама і вышэйшыя навучальныя ўстановы рыхтуюць такіх выпускнікоў. Мы ж у сваю чаргу імкнёмся падтрымліваць узровень дзейнай рэстаўрацыі. Нам не сорамна было б паставіць свае працы ў адзін шэраг з тым, што робяць польскія, расійскія, прыбалтыйскія і нават нямецкія рэстаўратары.

***— Відаць, што для вас рэстаўрацыя — гэта больш, чым праца; турбуе ўсё, што ў ёй адбываецца. Пэўна, яна ўжо стала часткай вашай душы?..***

— У першую чаргу я перажываю за людзей. Хацелася б, каб справядлівасць запанавала: любой краіне, нават маленькай і сціплай, такая арганізацыя неабходна. Без гісторыі, без культуры няма нацыянальнасці, самасвядомасці, гонару ў народа. Усяго гэтага не будзе, калі не будзе гістарычных помнікаў, якія мы акурат і імкнёмся захоўваць.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*



Парадная лесвіца ў Нясвіжскім палацы. Адрэстаўраваны жывапіс.

## У Белрэстаўрацыі працуюць дасведчаныя спецыялісты самых розных профіляў:

➢ **У Калядзічах, на вуліцы Бабушкіна, 72, размяшчаецца вытворчая база. Там знаходзяцца цэхі дрэваапрацоўкі, металаапрацоўкі, керамікі. Раней была каменячоска, але гэты від дзейнасці знік са спажывецкага рынку (у свой час былі зроблены каменныя вырабы для Нясвіжскага палаца і Мірскага замка), цяпер гэта справа законсерваваная.**

➢ **Актыўна дзейнічае цэх дрэваапрацоўкі, прафесійны стаж яго супрацоўнікаў налічвае некалькі дзесяцігоддзяў. Там ствараюць індывідуальныя сталярныя вырабы, якія не могуць вырабіць ні на адной фабрыцы. Гэта драўляныя вокны, дзверы, агароджы, краты, панэлі, поручні, іншыя дэкаратыўныя рэчы. Некаторыя нарыхтоўкі робяцца на станках, аднак у асноўным усе рэчы апрацоўваюцца рукамі.**

➢ **У вялікім цэху па працы з металам вырабляюцца вароты, крацістыя агароджы. Маецца ўласная кузня, дзе ствараюцца вырабы, абсалютна аналагічныя іх першапачатковаму выгляду. У майстэрні для ліцця можна адліць барэльефы і нават скульптуры.**

➢ **Спецыялісты керамічнага цэха вырабляюць плітку, пячную кафлю, вазы, гаршкі, фігуркі і любыя іншыя дэкаратыўныя элементы.**

## Извещение о реализации имущества ОАО «Барановичидрев» на торгах 20.05.2016 года

Председатель ликвидационной комиссии ОАО «Барановичидрев» Мищук А.М. проводит повторные торги в форме аукциона по реализации объектов недвижимости и прочего имущества.
Конт. тел. 8-029-6332490 vel.; (029) 2512009 МТС; факс (0163) 453392; E-mal: mischuk_am@mail

**Торги состояться 20 мая 2016 года в 14.00 по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3.**

**ЛОТ №2** – незавершенное капитальное строение, инв. №110/U-110556, пл. 559,1 м², расположенный на общем земельном участке с кадастровым №141000000003001974, стоимость лота – 92.044.400 рублей, без НДС. Седьмые повторные торги, скидка составила – 90%.

**ЛОТ №3** – объект недвижимости, капитальное строение с инв. № 110/С-110-940, пл. 851,9 м², здание специализированное для обработки древесины, цех сушильных камер на общем земельном участке с кадастровым №141000000003001974, стоимость лота – 173.092.500 рублей, без НДС. Седьмые повторные торги, скидка составила – 85%.

**ЛОТ №4** – турбогенераторная установка ТГ 06С/04-Р13/4,0, для выработки электрической энергии. Мощность – 6000 кВт., инв. №000027, стоимость лота – 558.208.960 рублей без НДС, четвертые повторные торги – скидка составила 80%.

**ЛОТ №5** – объект недвижимости, тарно-плотничный цех, пл. 1.584 м², инв. №110/С-90635, расположенный на общем земельном участке с кадастровым №141000000003001974, стоимость лота – 864.811.500 рублей, без НДС. Вторые повторные торги, скидка составила – 50%.

**ЛОТ № 6** – обрабатывающий центр ЧПУ-ROVER-B/50-BIESSE, инв. №194, предназначен для сверления и фрезерования панелей, стоимость лота – 453.000.000 рублей без НДС, вторые повторные торги, скидка – 50%.

**ЛОТ №7** – объект недвижимости, малярный цех, пл.1.471 м.кв., инв №000282, расположенное на общем земельном участке с кадастровым №141000000003001974, стоимость лота – 1.280.046.240 рублей, без НДС. Первые повторные торги, скидка составила – 10%.

***Сумма задатка: 10% от начальной цены лота в рублях РБ.***

***Получатель платежа: ОАО «Барановичидрев», УНП 200299909; р/с 3012122616138 в ф-ле ОАО «БПС-СберБанк», код 369, г. Барановичи.***

***Назначение платежа – задаток за участие в аукционе.***

***Задаток должен быть внесен до подачи заявления на участие в аукционе. Заверенный банком платежный документ прилагается к заявлению.***

Заявления на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, **в срок до 14 часов 00 минут 17.05.2016 г.** организатору торгов председателю ликвидационной комиссии Мищуку А.М. по адресу: 225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Восточный поселок, 3, ОАО «Барановичидрев».

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистраций.

Более подробно с условиями аукциона можно ознакомится на сайтах Госкомимущества и Министерства строительства и архитектуры с 29.04.2016 года.

**Председатель ликвидационной комиссии ОАО «Барановичидрев» А.М.МИЩУК**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 8 июня 2016 г. торгов по продаже конфискованного имущества

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества** | **Изолированное помещение № 36 с инвентарным номером 610/D-10646, расположенное по адресу: г. Борисов, ул. Демина, 39 (общая площадь: 7,1 кв.м; наименование: изолированное помещение № 36 торгового ряда № 13)** |
| **Местонахождение имущества** | Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Демина, д. 39, пом. 36 |
| **Начальная цена** | 144 895 600 рублей |
| **Сумма задатка** | 14 480 000 рублей |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона. Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, предмет торгов продается участнику, подавшему единственное заявление на участие в торгах по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона. Информация о размере затрат доводится до сведения участников перед началом аукциона.

**Аукцион проводится 8 июня 2016 г. в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Аб'ём прапановы на рынку нафты скарачаецца з-за падрываў нафтаводаў, закрыцця радовішчаў і іншых праблем у Калумбіі, Нігерыі і Лівіі, што стымулюе рост цэн на сыравіну, сцвярджае Bloomberg. Вытворчасць нафты ў Калумбіі ў сакавіку звалілася на 8% у параўнанні са снежнем і склала 916 тысяч бараляў штодня. Аналагічная сітуацыя склалася і ў Нігерыі, дзе вытворчасць «чорнага золата» скарацілася да 1,7 мільёна бараляў на дзень — самы нізкі ўзровень з 2009 года. Лівія здабывае 330 тысяч бараляў у дзень, тым часам як у 2011-м, да пачатку хваляванняў, гэты паказчык складаў 1,6 млн.

Калі б не гэтыя фактары, адзначае выданне, то лішак нафты на рынку павялічыўся б на 800 тысяч бараляў. Цяпер ён складае каля 1,5 мільёна бараляў.

«Левым партызанам у Калумбіі, баевікам у Нігерыі і паўстанцам у Лівіі ўдалося тое, чаго не змаглі дабіцца найбуйнейшыя сусветныя вытворцы нафты», — піша Bloomberg, намякаючы на правал перамоў пра замарозку ўзроўню здабычы нафты, якія прайшлі ў Катары 17 красавіка. «Паколькі ўся ўвага была прыкавана да саміту ў Досе, «слана не заўважылі», — лічыць аналітык Citigroup Эд Морс. Па яго ацэнцы, цяпер лішак прапановы на рынку невялікі, і свет стаў вельмі адчувальна рэагаваць на адсутнасць паставак з нестабільных краін-экспарцёраў.

Да шчасця для нафтавых цэн, правал у Досе супаў з трохдзённым страйкам у Кувейце, што прывяло да зніжэння здабычы нафты эмірата. Але гэта таксама прадэманстравала бессэнсоўнасць намаганняў па замарозцы: нізкія цэны ўжо прывялі да зніжэння паставак нафты на сусветны рынак. Страйк у Кувейце адбыўся з-за скарачэння зарплат у дзяржаўным сектары — простага выніку рэзкага падзення нафтавых прыбыткаў урада. Schlumberger, адна з найбуйнейшых у свеце нафтасэрвісных кампаній, заявіла пра скарачэнне дзейнасці ў Венесуэле, мясцовая дзяржаўная кампанія, якая адчувае вострым недахоп гатоўкі, больш не ў сілах плаціць па рахунках.

У красавіку краіны АПЕК давялі ўзровень аб'ёмаў здабычы нафты да 33,2 мільёна бараляў за суткі, што на 484 тыс. перавышае рэкорд, усталяваны ў 1989 годзе. Павелічэнне аб'ёмаў здабычы эксперты звязваюць з дзейнасцю Ірана, які спрабуе ўмацаваць свае пазіцыі на рынку вуглевадародаў пасля здымання санкцый. Сусветны банк прагназуе павелічэнне сярэднегадовай цаны на нафту ў 2016 годзе да 41 долара за барэль на фоне паслаблення долара і паляпшэння настрояў на рынках. Аднак кошт можа зменшыцца, калі члены АПЕК істотна павялічаць нафтаздабычу.

### «БАЧАННЕ» ЭР-РЫЯДА

Асобныя аналітыкі ўпэўнена сцвярджаюць, што цэны на нафту апусціцца да $30 за барэль цягам найбліжэйшых тыдняў. «Ёсць небяспечныя паралелі з 2015 годам. Рынак ужо награваецца, і таму наспела патрэба карэкцыі», — перакананы кіраўнік аддзела даследаванняў сыравінных тавараў у Commerzbank у Франкфурце Юджын Вайнберг.

У такіх абставінах Саўдаўская Аравія — насамрэч адзін з ключавых гульцоў на рынку «чорнага золата» — абнародавала маштабны план па збавенні краіны ад нафтавай залежнасці. Па ацэнках МВФ, у 2015 годзе дэфіцыт плацежнага балансу краіны склаў 6,3% ВУП, а сёлета ўзрос да 10,2%. У будучыні чакаецца, што ён панізіцца зноў прыкладна да 6%. Доўгі час падаткі на экспарт нафты складалі 90% дзяржаўных прыбыткаў; пасля зніжэння цэн на нафту з больш як $ 110 за барэль да менш як $30 прыбыткі яшчэ ў 2015 годзе зваліліся да ўзроўню ніжэйшага за 70%. Саўдаўская Аравія зафіксавала дэфіцыт бюджэту ў памеры $98 млрд — пры бюджэце ў 300 мільярдаў і прадукцыйнасці эканомікі каля 660 млрд. Міжнародны валютны фонд чакае сёлета запаволення росту эканомікі Саўдаўскай Аравіі на 1,2%. Аналітыкі фонду лічаць, што без правядзення рашучых дзеянняў казна каралеўства можа вытрымаць не больш за пяць гадоў.

Лагічна, што Савет міністраў Саўдаўскай Аравіі ўхваліў праект эканамічных рэформаў «Бачанне-2030», і дакумент быў падпісаны каралём. «Гаворка ідзе пра тое, каб павялічыць прыбыткі ад галін, не звязаных з вытворчасцю нафты, да 267 мільярдаў долараў да 2030 года. Адна частка гэтых сродкаў паступіць шляхам інвестыцый, другая дзякуючы дыверсіфікацыі эканомікі. Гэта адкрые перад намі магчымасці для выкарыстання незадзейнічаных цяпер актываў. Мы спадзяёмся дасягнуць высокіх вынікаў ужо ў першыя 5 гадоў», — сказаў другі спадчынны прынц Мухамед бэн Сальман.

Праўда, ёсць і іншыя погляды. Так, усходазнавец, член экспертнага савета Саюза нафтагазапрамысловцаў Расіі Эльдар Касаеў лічыць, што падобнымі заявамі каралеўства чарговы раз спрабуе расхістаць нафтавы рынак: «З гэтай жа мэтай двойчы (у лютым і красавіку) праводзіліся перамовы ў Досе. Рынак чапляецца за кожную навіну. Калі саўдыты проста скажуць, што дамаўляцца ні пра што не будуць і не плануюць злазіць з нафтавай іголкі, то ў момант абвалляцца каціроўкі. Гэта зусім не выгадна Эр-Рыяду». Відавочна, што інтрыга на рынку «чорнага золата» захоўваецца.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*

## Извещение о проведении 3 июня 2016 г. торгов по продаже конфискованного имущества

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение, продаваемого имущества)** | Капитальное строение с инвентарным номером 633/С-7436 – здание жилого дома общей площадью 39,2 кв.м с составными частями и принадлежностями, расположенное по адресу: Минская область, Мядельский район, Княгининский сельсовет, д. Нивки д. 64 (назначение: здание одноквартирного жилого дома) |
| **Начальная цена** | 52 185 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 5 200 000 белорусских рублей |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, ком. 10 |

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке учета, хранения, оценки и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 № 559, и порядком проведения аукциона, утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, определенной организатором аукциона); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, определенной организатором аукциона); копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток перечисляется на расчетный счет №3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369; получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», УНП 190398583. Сумма задатка для участия в аукционе должна быть внесена в срок, установленный для приема документов.*

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором аукциона. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем аукциона, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона. Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение срока, указанного в протоколе о результатах аукциона.

**Аукцион проводится 3 июня 2016 г. в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 04.05.2016 по 31.05.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-40-22, (017) 327-48-36**

---

16 мая 2016 г. в 10.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Лорри-Сервис».

Повестка дня:

1. Об исполнении обязательств.

Местонахождение ОАО «Лорри-Сервис»: г. Брест, ул. Дубровская, 36.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Дубровская, 36.

Время регистрации в день проведения собрания с 09.30 до 10.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни с 10.05.2016 (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Совет директоров.

УНН 200246280

---

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гроднорайагросервис» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: Гродненская обл., Гродненский р-н, Обуховский с/с, д. Котра, ул. Молодежная, 2, в составе:**

**Предмет аукциона**

| Наименование | Инвентарный номер | Общая площадь |
|---|---|---|
| Площадка на 50 автомашин (проезд) | 401/С-22130 | общ. пл. покрытия 7485 кв.м |
| Открытая стоянка тракторов (проезд) | 401/С-22131 | общ. пл. покрытия 6919 кв.м |
| Подъездные пути (проезд) | 401/С-22132 | общ.пл. покрытия 5319 кв.м |
| СТО на 100 автомобилей | 401/С-11650 | 1682,9 кв.м |
| Столярный цех | 401/С-11656 | 1006,8 кв.м |
| Мастерские | 401/С-11654 | 991,2 кв.м |
| Склад | 401/С-11651 | 636,7 кв.м |
| Здание гостиницы | 401/С-9639 | 661,3 кв.м |
| Здание административно-хозяйственное | 401/С-11655 | 482,3 кв.м |
| Кафе-бар | 401/С-9640 | 374,1 кв.м |
| Диспетчерская | 401/С-11653 | 57,7 кв.м |
| Проходная | 401/С-11652 | 131,3 кв.м |
| Автозаправочная | 401/С-18230 | 12,5 кв.м |
| Трансформаторная подстанция | 401/С-11657 | 40,6 кв.м |
| Сооружения благоустройства | 401/С-22133 | - |
| Канализационная сеть (ливневая) | 401/С-22050 | протяженность 183 м |
| Канализационная сеть (фекальная) | 401/С-22049 | протяженность 320,8 м |
| Тепловая сеть | 401/С-22052 | протяженность 58 м |

в т.ч. оборудование: кран-балка 3т, инв. № 5016; кран-балка подвесная, инв. № 1856; ТРК Квантум-500, инв. № 9990397; ТРК Квантум-500, инв. № 9990396, многолетние насаждения

В технические паспорта капитальных строений в качестве составных частей и принадлежностей внесены отдельные сооружения благоустройства, элементы инженерных сетей

**Начальная цена с НДС 20% – 12 324 575 739 бел. руб. (снижена на 50%)**

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | пл. 8,6869 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для эксплуатации и обслуживания зданий, с установленным ограничением – водоохранная зона водных объектов (пл. 7,8135 га) |

**Задаток 5% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYR) перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012743260072; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012743260098; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия реализации предмета аукциона** | Вовлечение в хозяйственный оборот в течение трех лет с момента заключения договора купли-продажи |

**Условия оплаты:** если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, оплата стоимости имущества должна быть произведена в течение **30** (тридцати) календарных дней после проведения аукциона

*Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 20.01.2016*

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также порядок оплаты вознаграждения и возмещения суммы фактических затрат за организацию и проведение аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

| | |
|---|---|
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **07.06.2016 в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Понемуньская, 27, ОАО «Гроднорайагросервис»** |
| **Дата, место, время окончания приема документов** | **03.06.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |

**Тел.: +375 17 280 36 37; +375 29 183 69 71.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by. Сайт: www.cpo.by**

---

## ОБЪЯВЛЕНИЕ
## о проведении публичных торгов по продаже имущества, принадлежащего ЧПТУП «ГрандСтиль-Мебель»

| | |
|---|---|
| **Вид выставленного на торги имущества** | Недвижимость |
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **ЛОТ № 1. Станок форматнораскроечный NEW LINEBY WINTER M45-3200, серийный №10121516, начальная стоимость лота 72 917 000 рублей ЛОТ № 2. Станок кромкооблицовочный GIONI F380B, начальная стоимость 20 167 000 рублей ЛОТ №3 Пила угловая MAKITA LS 1040, начальная стоимость 3 045 000 рублей** |
| **Принадлежность** | ЧПТУП «ГрандСтиль-Мебель» |
| **Наличие обременений** | Арест отдела принудительного исполнения Первомайского района г. Витебска |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Лот № 1: г. Витебск, ул. Ломоносова, 2, склад технического имущества №200/С-51331 Лот № 2: г. Витебск, ул. Ломоносова, 2, склад технического имущества №200/С-51331 Лот № 3: г. Витебск, ул. Ломоносова, 2, склад технического имущества №200/С-51331 |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения Первомайского района г. Витебска, г. Витебск, **ул. Комсомольская, 31 кабинет 22 26 мая 2016 года в 10.00** |
| **Справочная информация** | Справочная информация об организации торгов: ГУЮ Витоблисполкома 210101, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by. Начальник отдела Лысёнок Денис Александрович, тел.: 8 (0212) 37 46 38, +37533 616 17 80 Судебный исполнитель Рыбаков Сергей Александрович, тел. 8 (0212) 33 64 69, +37533 399 90 87 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет отдела принудительного исполнения Первомайского района г.Витебска № 3642903000315 в филиале № 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 18.00 23 мая 2016 года.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |

---

УНП 100122846

## ОАО «Белхим» ПРИГЛАШАЕТ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПРОЦЕДУРЕ ПЕРЕГОВОРОВ

**ПО ОКАЗАНИЮ ИНЖЕНЕРНЫХ УСЛУГ ПО ОБЪЕКТУ:**

**Внешнее электроснабжение производственной базы хранения, переработки и оптовой торговли химической продукции (повышения надежности электроснабжения)»**

**Фанипольская база ОАО «Белхим» г. Фаниполь ул. Заводская, 25.**

**Предложения принимаются до 14.00 06.05.2016 г. по адресу: г. Минск, ул. Короля, 34, каб. №19.**

Справки по тел. 8017 204-85-17, факс 8017 204-85-19, e-mail: pto@belhim.by.

---

## Острошицкий сельский исполнительный комитет (организатор аукциона)
### извещает о проведении 03 июня 2016 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Ограничения в использовании, инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Расходы по изготовлению документации (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Кондратовичи, ул. Дорожная, 6, кадастровый номер 623286303101000096 | 0,1350 | Водоохранная зона пруда в н.п. сети водоснабжения, электроснабжения, газ | 36 889 000 | 3 688 900 | 13 657 000 |
| 2 | д. Кондратовичи, ул. Дорожная, 8, кадастровый номер 623286303101000094 | 0,1347 | Водоохранная зона пруда в н.п. сети водоснабжения, электроснабжения, газ | 36 807 000 | 3 680 700 | 13 684 500 |
| 3 | д. Ребрище, пер. Центральный, 1 (уч. № 3), кадастровый номер 623286307601000066 | 0,1380 | Охранная зона сетей водоснабжения; в н.п. сети водоснабжения, электроснабжения | 34 201 100 | 3 420 100 | 16 222 000 |

Дата, время и место проведения аукциона: **03 июня 2016 года в 10.00** по адресу: Логойский район, аг. Острошицы, ул. Центральная, д. 8, Острошицкий сельский исполнительный комитет.

Прием документов: ежедневно с 8.00 до 17.00 (кроме воскресения) **по 30.05.2016 г. включительно.**

К заявлению прилагаются квитанция об оплате задатка и копия личного паспорта.

*Задаток перечисляется на расчетный счет 3600619141101 в ЦБУ 611 филиала № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 153001601, УНН 600537220, код платежа 04901, получатель Острошицкий сельский исполнительный комитет.*

**Условия:** победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

Конт. тел.: (801774) 57 6 21, 57 6 35, 57 6 36; (+37529) 6444886.

---

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **Смолевичское районное потребительское общество, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, д. 133** |

**Предмет аукциона**

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес |
|---|---|---|---|
| **Лот №1** | | | |
| **Здание магазина №41** | 194 кв.м | 614/С-42092 | Минская обл., Смолевичский р-н, Озерицко-Слободской с/с, д. Динаровка |
| **Сведения о земельном участке:** пл. **0,0925 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания магазина № 41 | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 390 640 000 белорусских рублей** | | | |
| **Лот №2** | | | |
| **Здание магазина** | 82,3 кв.м | 614/С-18990 | Минская обл., Смолевичский р-н, Усяжский с/с, д. Избицкое |
| Составные части и принадлежности | | | сарай |
| **Сведения о земельном участке:** пл. **0,0410 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 338 960 000 белорусских рублей** | | | |
| **Лот №3** | | | |
| **Здание магазина №53** | 60 кв.м | 614/С-20628 | Минская обл., Смолевичский р-н, Пекалинский с/с, д. Пятилетка |
| **Сведения о земельном участке:** пл. **0,0459** га предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания здания магазина | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 131 131 000 белорусских рублей** | | | |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010, в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

*Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано газете «Звязда» от 04.02.2016*

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **24.05.2016 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **20.05.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 2, пом. 1703, оф. 5, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375-17-280-36-37, +375-29-183-69-71, E-mail: uction@cpo.by, www.cpo.by** |

---

## Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2**

- ✓ Оценка оборудования и транспортных средств
- ✓ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ✓ Раздел и вычленение недвижимости и земельных участков

## Извещает о проведении повторного аукциона по продаже имущества ОАО «Гомельский радиозавод», 8(0232) 21 60 07

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | – Капитальное строение (сооружение специализированное железнодорожного транспорта (повышенный путь (разгрузочная площадка)) с инв. № 350/С-170232, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9, составные части и принадлежности: железобетонное покрытие площадью 1135 кв.м, металлическая смотровая площадка площадью 15 кв.м, металлическая прожекторная мачта длиной 9,0 м и 7,0 м, насыпь железнодорожная (щебенка) площадью 1080 кв.м. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000005005687 площадью 27,9350 га | 786 600 000 | 78 660 000 |
| 2 | – Капитальное строение (здание специализированное растениеводства) с инв. № 350/С-157408, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9/22, площадь – 6186,1 кв.м, по начальной цене – 1 450 539 439 бел. руб. с НДС. – Капитальное строение (здание административно-хозяйственное) с инв. № 350/С-160196, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9/25, площадь – 10,3 кв.м, по начальной цене – 20 400 000 бел. руб. с НДС. Составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие по щебеночному основанию площадью 575,0 кв.м., забор железобетонный площадью 3840,0 кв.м, трое ворот металлических на бетонных столбах, железной дороги длиной 200 м, бетонные бортовые камни длиной 90 м.п., по начальной цене – 651 600 000 бел. руб. с НДС. Объект расположен на земельном участке с кадастровым номером 340100000005006756 площадью 3,0099 га | 2 121 939 439 | 212 193 943 |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 12 мая 2016 г. в рабочие дни с $9^{00}$ до $16^{00}$ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **13 мая 2016 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2** |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО«БПС-Сбербанк», код 369, УНП 102353509 Получатель платежа: Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |
| **Условия продажи** | Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 20-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договору купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. **Победителю аукциона по Лоту №2 предоставляется рассрочка платежа сроком на 6 (шесть) месяцев.** |

**Дополнительная информация по тел.: (0232) 75 06 62, 75 06 63 (факс) и на сайте www.bti.by**

# ЧЭМПІЁН ПА МЯНУШЦЫ «КІРЫ»

## Васіль Кірыенка пра выступленне ў найлепшым велаклубе свету, захапленні сваіх дзяцей і планы на Алімпіяду

**Самы вядомы беларускі велагоншчык у мінулым годзе стаў чэмпіёнам свету і выйграў Еўрапейскія гульні, падчас сезона неаднойчы быў у прызёрах прэстыжных прафесійных гонак Італіі, Францыі і Польшчы. Сёлета ён працягне выступаць у адным з найлепшых велаклубаў планеты — брытанскім «Скай», а таксама пазмагаецца за медалі Алімпійскіх гульняў у Рыа-дэ-Жанэйра. Напярэдадні заканчэння адпачынку мы сустрэліся з вядомым спартсменам і пагаварылі пра тое, чаму яго сям'я, нягледзячы на фінансавую незалежнасць, працягвае жыць у Рэчыцы; на што Васіль выдаткаваў свае першыя прызавыя і колькі ровараў захоўваецца ў яго кватэры.**



***— Васіль, адпачынак падыходзіць да завяршэння, раскажыце, як яго правялі?***

— Шмат часу быў дома, у Рэчыцы, з сям'ёй. Можна сказаць, што адпачываў актыўна, таму што ўсё роўна трэніраваўся, проста знізіў нагрузку. Цяпер займаюся звыклымі справамі дома, атрымліваю асалоду ад вясны, мне вельмі падабаецца гэтая пара года.

***— У Рэчыцы жывяце за горадам?***

— Не, у самім горадзе, у бацькоўскай хаце, куды прыехаў, калі мне быў годзік. Атрымліваецца, жыву там 33 гады, цяпер ужо са сваёй сям'ёй.

***— Як плануеце правесці час да Алімпійскіх гульняў?***

— Хутка еду ў Іспанію, з сярэдзіны мая буду праходзіць збор са сваім клубам на Тэнерыфе, там, на высакагор'і, размесцімся каля падножжа вулкана. Канкрэтна падрыхтоўкі да Гульняў у маім графіку няма. Галоўнае — добра прайсці Тур дэ Франс, а пасля яго правільна аднавіцца.

**На свае першыя прызавыя павіншаваў дзеда з Днём Перамогі.**

***— Якія задачы ставіце перад сабой на Алімпіяду?***

— Не хачу з'ездзіць у Бразілію дзеля галачкі, проста так, усё ж такі не блізкі свет *(смяецца)*. Вядома, буду старацца выступіць там добра і заваяваць медаль. У мяне ёсць заўзятары ў розных пунктах свету, яны хвалююцца за мяне, таму хацелася б апраўдаць іх надзеі. Адначасова я з'яўляюся і работнікам Міністэрства спорту, адпаведна, нейкія задачы ставяцца і там. Калі ў мінулым годзе ў мяне атрымаўся вельмі добры сезон, проста супер, то ў гэтым мне б хацелася пацвердзіць тое, што я магу выступаць на высокім узроўні. Перш за ўсё даказаць гэта самому сабе. Я рэальна гляджу на рэчы, таму не магу даць ніякай гарантыі, нават 50 працэнтаў, што змагу заваяваць медаль на Алімпійскіх гульнях.

***— Ад чаго будзе залежаць поспех або яго адсутнасць?***

— Шмат што будзе залежаць ад трасы. Я бачыў яе на відэа, але гэта яшчэ ні пра што не гаворыць, візуальна можна вывучыць толькі павароты, а вось перапады вышынь вокам не адчуеш. Ну і, вядома, будзе важнай фізічная форма, у якой я падыду да гэтага старту.

***— Для клуба прэстыжна, што яго спартсмен — удзельнік Алімпійскіх гульняў?***

— Ад «Скай» не толькі я буду выступаць на Алімпіядзе і, відома, яны цэняць гэта. Пры планаванні сезона галоўны трэнер па фізічнай падрыхтоўцы звяртаў увагу на турнір чатырохгоддзя, і ён сказаў мне, што там будзе цяжкая траса, але яна падыходзіць мне па рэльефе. Мая каманда верыць у мяне.

***— Не сакрэт, што «Скай» — адзін з найлепшых велаклубаў у свеце. Раскажыце пра атмасферу там.***

— Перш за ўсё, у гэтым клубе я цаню прафесійнае стаўленне да справы. «Скай» — гэта каманда, у якой спартсмену прадастаўлены максімальныя ўмовы для паказу найвышэйшых дасягненняў. Каманда дапамагае спартсменам ва ўсім, пачынаючы з арганізацыі паездак, заканчваючы афармленнем віз (у маім выпадку). Калі ты прымаеш мінімальны ўдзел у падобных працэсах, гэта вельмі палягчае спартыўнае жыццё.

Што тычыцца міжасобасных адносін у калектыве, то я не магу сказаць, што гэта мае сябры, але ўсе спартсмены для мяне — добрыя прыяцелі, гэта людзі, да якіх я магу звярнуцца па дапамогу і падставіць ім сваё плячо.

***— Здаецца, сучасны спорт ужо не ўявіш без гучных допінгавых скандалаў, а адзін з самых буйных быў звязаны менавіта з веласпортам.***

— Мая каманда да допінгу ставіцца адмоўна, як і ў цэлым увесь веласпорт. Падкрэслю, гэта стаўленне не паблажлівае, а катэгарычнае. У веласіпедным спорце ёсць такі закон: калі на працягу «Ворд тура» (аднаго сезона) у камандзе з'явіліся два чалавекі са станоўчай допінг-пробай, ёсць вялікая верагоднасць, што каманда пазбавіцца ліцэнзіі. Усё гэта вельмі сур'ёзна. Мы заўсёды знаходзімся пад маніторынгам не толькі з боку ВАДА, але і многіх іншых службаў, часам не ведаеш, адкуль яны з'яўляюцца ў цябе дома.

***— Але ж рэсурсы чалавечага арганізма не бязмежныя.***

— Так, мне б не хацелася хаваць, што нам дапамагаюць нейкімі спосабамі падтрымліваць арганізм. Гэтае падсілкоўванне праяўляецца ў харчовых дабаўках і вітамінах. Дарэчы, у нас у камандзе катэгарычна забаронена выкарыстоўваць які-небудзь старонні прадукт, напрыклад, дома я не магу выпіць пратэінавы кактэйль выворцы, які не ўзгоднены са спецыялістамі клуба.

Ведаеце, людзі, далёкія ад веласпорту, не зусім разумеюць, што адбываецца ў арганізме чалавека, які штодня ездзіць на роварах. Мая звычайная трэніроўка доўжыцца дзесьці 4,5 — 5 гадзін. Бываюць трошкі карацейшыя, але тады больш інтэнсіўныя. Калі занятак разлічаны на адпрацоўку вынослівасці, тады я катаюся па 6-7 гадзін. Гэта складана вынесці непадрыхтаванаму чалавечаму арганізму. Тут яшчэ вялікае значэнне мае харчаванне і якасць прадуктаў.

***— Якая перамога на гэты момант з'яўляецца самай каштоўнай для вас?***

— «Золата» чэмпіянату свету ў Рычмандзе ў мінулым годзе. І ў першую чаргу яна важная для мяне,

**Біяграфічная даведка**

**Васіль Кірыенка нарадзіўся 28 чэрвеня 1981 года ў горадзе Рэчыца (Гомельская вобласць). З'яўляецца прафесійным шашэйным велагоншчыкам, выступае за каманду Sky Procycling. Чэмпіён свету ў гонцы з раздзельным стартам (2015), чэмпіён першых Еўрапейскіх гульняў. Пераможца прэстыжных велашматдзёнак «Джыра д'Італія», «Вуэльта», прызёр «Тур дэ Франс».**

таму што здабыта мной пад сцягам роднай краіны — Беларусі.

***— У дзяцінстве марылі стаць вядомым спартсменам?***

— Не, і сапраўды не мог выказаць здагадку, што веласпорт стане маёй працай. У 11 гадоў я навучыўся ездзіць на роварах і адразу запісаўся ў секцыю, тады і не думаў, што такі занятак будзе забяспечваць маю сям'ю.




Васіль пасля перамогі на чэмпіянаце свету.

***— На што патрацілі свае першыя прызавыя?***

— Упершыню грошы ў веласпорце я атрымаў, калі выйграў гонку «крытэрыум»; як цяпер памятаю, там я пайшоў у вялікі адрыў і перамог. Атрымаў за гэта абсалютна невялікія грошы, на іх мы з братам вырашылі павіншаваць дзядулю з Днём Перамогі. Тэлеграмай ужо не паспявалі, заказалі «маланку», якая каштавала нашмат даражэй.

***— У вашай сям'і ва ўсіх ёсць веласіпеды?***

— У мяне дома ўжо склад. Ёсць мой трэніровачны — гэта святое, у Іспаніі ў мяне таксама трэніровачны і яшчэ асобны для індывідуальных гонак. У сына — два ровары, у кожнай дачкі таксама свой асабісты, а вось у жонкі веласіпеда няма, але ў мяне ёсць яшчэ горны, на ўсялякі выпадак *(смяецца)*.

***— А ці карыстаецеся роварам для руху па-за трэніроўкамі?***

— Так, я карыстаюся гібрыдным роварам у Іспаніі, ён электрычны, гэта значыць, чым больш ты ціснеш на педалі, тым болей табе дапамагае ехаць электраматор на заднім коле. Я выкарыстоўваю яго для язды на пошту, напрыклад, або ў цэнтры горада: гэта значна зручней, чым аўто. У Рэчыцы са сваімі дзецьмі выязджаю на прагулкі на самакаце ці ролікавых каньках, трэба быць у трэндзе з моладдзю.

**Мая самая важная перамога здабыта пад сцягам роднай краіны.**

***— На вуліцах вас пазнаюць?***

— Так, перад Новым годам мне нават уручылі званне ганаровага грамадзяніна Рэчыцы. Мне прыемна ўсведамляць, што людзі на радзіме сочаць за маёй кар'ерай, перажываюць за мяне. Ведаю, што сярод прыхільнікаў не толькі моладзь, якая цікавіцца спортам, але і людзі, як кажуць, што ўжо пажылі. У Іспаніі, па словах маіх прыяцеляў з каманды, я таксама досыць папулярны.

***— Раскажыце пра сваю сям'ю?***

— У мяне цудоўная жонка, па прафесіі яна стаматолаг, вучылася ў мінскім медыцынскім універсітэце (гэта, дарэчы, і дапамагло нам пазнаёміцца). У Рэчыцы мы вучыліся ў адной школе, але не ведалі адно аднаго. Цяпер жонка знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску, нашай малодшай дачцэ зусім нядаўна споўнілася 2 гадкі. Старэйшая дачка Юлія вучыцца ў школе, вельмі актыўная дзяўчынка, любіць фізкультуру і танцы. Яна займаецца лёгкай атлетыкай і харэаграфіяй. Сын Аляксей — сур'ёзны хлапчук, ён такі разважлівы, хоць яшчэ толькі ходзіць у садок. Пакуль нічым канкрэтна не займаецца, але Лёшу падабаюцца аўтамабілі і веласіпеды. Ён з задавальненнем ганяе на іх у двары вось ужо два сезоны. Цяпер я яму прывёз новы ровар — гоначны, ад якога ён проста ў захапленні. Самая маленькая, Дар'я, падобная да абаіх старэйшых дзяцей, ужо таксама сядзіць на ровары.

***— Напэўна, шмат у каго ўзнікае пытанне: чаму не перавозіце сям'ю ў Іспанію ці хаця б у Мінск?***

— У Іспаніі я сам бываю вельмі рэдка, бо ў мяне то гонкі, то трэніроўкі, таму забіраць іх туды няма сэнсу. Да таго ж, калі я працую, то імкнуся аддавацца гэтай справе максімальна, таму ў гэтым плане ёсць нават нейкая зручнасць. Можа быць, хтосьці скажа, што гэта няправільна, але я лічу, гэта нармальна. Я не прывязаны да дробных сямейных праблем, яны не выбіваюць мяне з працы. Плюс трэба разумець, што ўсё ж Іспанія — чужая краіна, родных там няма, таму на дапамогу разлічваць не даводзецца.

А што тычыцца Мінска, то гэта вялікі горад, мне ён не вельмі падабаецца для жыцця. Мы будуем дом за горадам, таму хутка, магчыма, пераедзем туды.

# УЗНАГАРОДА ЗА СУМЛЕННАСЦЬ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» падводзім вынікі чарговага тура чэмпіянату краіны па футболе, расказваем пра перамогу гомельскіх гандбалістак у Кубку Беларусі і завяршэння падрыхтоўкі хакеістаў да чэмпіянату свету.**

***1. Па выніках пасяджэння выканкама міжнароднай арганізацыі Fair Play беларускаму самбісту Сцяпану Папову будзе ўручаны дыплом за жэст у духу сумленнай барацьбы.*** Усяго на саісканне ўзнагароды ў намінацыях «Жэст Fair Play», «Прапаганда прынцыпаў Fair Play», «Кар'ера ў стылі Fair Play» было вылучана 49 кандыдатаў з больш як 20 краін.



Нагадаем, жэст у стылі «Fair Play» (сумленная барацьба) беларускі самбіст з Лепеля Сцяпан Папоў прадэманстраваў у фінальным паядынку першых Еўрапейскіх гульняў у Баку. З першых секундаў паядынку ў вагавай катэгорыі да 74 кг супраць Аміла Гасімава з Азербайджана было зразумела, што наш спартсмен накіраваны выключна на перамогу. Сцяпан адразу ж павёў у ліку, а праз некаторы час правёў болевы прыём, за што яму была прысуджана чыстая перамога. У выніку прыёму сапернік атрымаў траўму, а Сцяпан Папоў дапамог яму пакінуць дыван.

***2. Завяршыўся пяты тур футбольнага чэмпіянату.*** Свае першыя паражэнні пацярпелі два дэбютанты вышэйшай лігі. «Крумкачы» ў Жодзіне не змаглі справіцца з "Тарпеда-БелАЗ" — 0:3. Футбалісты «Іслачы» прайгралі брэсцкаму «Дынама» — 2:4. «Гарадзея» згуляла ў нічыю з мікашэвіцкім «Гранітам» — 0:0. Лідар турніру барысаўскі БАТЭ ў Бабруйску абыграў «Белшыну» — 3:2. Не змаглі дамагчыся перамогі футбалісты мінскага «Дынама», якія прымалі на сваім полі «Слуцк» — 1:1. У Мазыры футбалісты «Віцебска» ўзялі верх над мясцовай «Славіяй» — 4:0. Наваполацкі «Нафтан» прайграў у Салігорску «Шахцёру» — 0:2, гродзенскі «Нёман» на сваім полі саступіў «Мінску» — 0:1.

Адзначым, што мінулы тур стаў самым выніковым у цяперашнім першынстве — у васьмі матчах забіта 23 мячы. Шосты тур чэмпіянату краіны пройдзе 7-8 мая, першыя тры радкі першынства пакуль за БАТЭ, ФК «Мінск» і ФК «Іслач».

***3. Гандбалісткі «Гомеля» другі раз запар сталі ўладальніцамі Кубка краіны, у фінале яны перамаглі сталічны «БНТУ-БелАЗ» — 30:29.*** Асноўны час не выявіў пераможцу, лёс паядынку вырашыўся толькі ў авертайме.

У наступныя выхадныя ў Брэсце пройдзе вырашальны этап розыгрышу Кубка Беларусі сярод мужчынскіх камандаў. У паўфінале 6 мая мінскі СКА згуляе з магілёўскім клубам «Машэка», а БГК пазмагаецца з «Гомелем». Пераможцы сустрэч выйдуць у фінале на пляцоўку «Вікторыі» 7 мая.

Фінальная серыя за «золата» нацыянальнага першынства, у якой згуляюць СКА і БГК, пачнецца 18 мая. За «бронзу» паспрачаюцца «Гомель» і «Кронан».

***4. Нацыянальная хакейная зборная завяршае падрыхтоўку да чэмпіянату свету.*** Напярэдадні нашы хакеісты згулялі ў Еўрачэленджы са зборнай Германіі. Першы матч скончыўся з лікам не на нашу карысць — 3:5. У паўторным паядынку падапечныя Дэйва Льюіса былі мацнейшыя за немцаў — 4:3.

Зараз зборная Беларусі вяртаецца ў Мінск, дзе да 4 мая будзе рыхтавацца да сусветнага форуму. Чэмпіянат свету па хакеі пройдзе з 6 па 22 мая ў Санкт-Пецярбургу і Маскве. Зборная Беларусі на папярэдняй стадыі згуляе ў групе В: 6 мая — з Фінляндыяй, 7 мая — з ЗША, 9 мая — з Канадай, 11 мая — са Славакіяй, 13 мая — з Германіяй і 14 мая — з Венгрыяй.

**Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
lobazhevich@zviazda.by

■ Наўздагон

# З КОЛЕРАМ! З ГОНАРАМ! З РОВАРАМ!

## На мінскі велакарнавал прыехала больш як 9 тысяч чалавек

**У апошні дзень красавіка на праспекце Пераможцаў прайшло самае масавае ў гісторыі адкрыццё веласезона. Удзел у свяце прынялі не толькі тысячы велааматараў з розных рэгіёнаў Беларусі, але і знакамітыя беларускія спартсмены, а таксама службоўцы. Да грандыёзнага велапараду далучылася са сваім двухколавым сябрам і карэспандэнт «Звязды».**



Карэспандэнт «Звязды» таксама паўдзельнічала ў адкрыцці сезона.

Паколькі «Viva, ровар!» праходзіў у фармаце карнавалу, то я вырашыла ў гэты дзень начапіць самаробныя крылы матылька. Насамрэч, думала, на просьбу арганізатараў «прыехаць у карнавальным касцюме і зрабіць свята больш яркім» адгукнецца большая колькасць удзельнікаў. Тым не менш былі цікавыя вобразы. Запомніліся спадарыня бальзакаўскага ўзросту ў касцюме анёла, дзяўчына на гарадскім ровары ў вобразе вясны, каларытны дзядуля ў майцы з надпісам «СССР». Былі раварысты ў медыцынскіх халатах, і ў салдацкай форме на рарытэтных жалезных конях. Дарэчы, акрамя самых папулярных звычайных «горнікаў» ды «гібрыдаў», я прыкмеціла нават адзін электравеласіпед. Спадабаўся і ровар для дваіх: з двума крэсламі і дзвюма парамі педаляў. Усцешыла, што многія ўдзельнікі велакарнавалу прыехалі ў вышыванках ды вышымайках.

Пачалося ж усё з таго, што ўсе 9 тысяч удзельнікаў, якія загадзя зарэгістраваліся ў інтэрнэце, атрымалі іменныя нумарныя знакі з уласным фотаздымкам. І дружна выехалі на праспект Пераможцаў, які больш як на гадзіну быў перакрыты для машын дзеля свята. Ад стэлы «Мінск — горад-герой» мы даехалі да Мінск-Арэны, там развярнуліся і назад — у парк Перамогі. У суме накруцілі дзесьці 10 кіламетраў.

Накіроўвалі калону міністр спорту і турызму Беларусі Аляксандр Шамко, старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац, чэмпіён свету па веласіпедным спорце ў індывідуальнай гонцы з раздзельным стартам Васіль Кірыенка, васьміразовая чэмпіёнка свету па веласпорце на трэку, прызёр Алімпійскіх гульняў і мама чатырох дзетак Наталля Цылінская.

Наталля прызналася: яна не чакала, што беларусы так масава падтрымаюць старт сезона: *«Калі мы ехалі па праспекце, я азіралася некалькі разоў, спрабавала ўбачыць «хвост». Не ўдалося. З кожным годам наша колькасць будзе толькі павялічвацца. Дыстанцыя будзе павялічвацца, хуткасць».* Дарэчы, летась, у першым велапарадзе, прыняло ўдзел толькі 3 тысячы чалавек.

Пакуль ехалі, злавіла сябе на думцы, што агульная справа яднае і падымае настрой. І не толькі раварыстам, але і пешаходам, якія, нягледзячы на тое, што ім даявялося доўга чакаць грамадскі транспарт, зусім не раздражняліся. Наадварот, спыняліся на ўзбочыне і здымалі нас на мабільныя тэлефоны, падтрымлівалі сваімі ўсмешкамі, жэстамі, крыкамі.

*«Такія мерапрыемствы нефармальнага характару дапамогуць прывіць любоў да спорту, здаровага ладу жыцця, асабліва маладому пакаленню,* — лічыць міністр спорту і турызму Беларусі Аляксандр Шамко. — *Паглядзіце, як шмат тут маладых людзей, дзяцей. Людзі прыйшлі з сем'ямі».*

Сапраўды, было вельмі шмат бацькоў з дзеткамі. Самых маленькіх садзілі на велакрэслы, большыя ехалі на сваіх дзіцячых роварах. Падчас параду пазнаёмілася з Дзмітрыем Галацэвічам: *«Як заўзяты веласіпедыст, я проста не мог не прыехаць сюды ўсёй сям'ёй. Чакаў, што будзе крута, але што настолькі, нават уявіць не мог! Дзень праляцеў на адным дыханні! Для дзяцей, вядома, гэта незабыўнае ўражанне. Пабольш бы такіх мерапрыемстваў!»*

Вельмі абрадавалася, калі ўбачыла герояў сваіх артыкулаў — Дзмітрыя Цімашкова з дачкой Ліляй, у якой цяжкая форма ДЦП. Усцешыла, што яны былі не адны, а з вялікай камандай бацькоў-аднадумцаў «Крылы анёла»: *«Дзякуючы арганізатарам, наш удзел у велапарадзе быў настолькі паўнавартасным, што наша «асаблівасць» адышла на задні план. Яна ўзнікала толькі тады, калі час ад часу даносілася «Глядзі!.. Глядзі-і, якая крутая каляска паехала!..» Малаверагодна, каб нехта бачыў сувязь паміж нашымі калясками і інваліднасцю. Быць «крутымі» — вельмі прыемна, праўда! І дзеці былі шчаслівыя».*

Удзельнічаў у велапарадзе і Джон Росмэн, амерыканец з беларускім грамадзянствам, актывіст Мінскага веласіпеднага таварыства. Джон не карыстаецца грамадскім транспартам і нават узімку перасоўваецца па горадзе на ровары: *«Вельмі хочацца змяніць стаўленне да веласіпедаў у Беларусі. Каб людзі, асабліва якія жывуць у гарадах, зразумелі, што гэта звычайны сродак перамяшчэння. На ім можна не толькі катацца ў выхадны дзень, але і дабірацца на працу. Па-першае, веласіпед вельмі карысны для здароўя і дапамагае трымаць сябе ў форме. Па-другое, гэта яшчэ і самы экалагічны від транспарту! Калі параўноўваць веласіпед і аўтамабіль, то веласіпед значна танней і купіць, і абслугоўваць. А самае галоўнае, добры настрой з самага ранку гарантаваны».*

Пасля велапараду ўсе накіраваліся ў парк Перамогі, дзе спартсмены раздавалі аўтографы ўсім ахвотным. Многія велааматары прасілі чэмпіёнаў свету пакінуць подпіс на раме ровара. Самыя актыўныя ўдзельнічалі ў незвычайных конкурсах, якіх было процьма: і перацягванне каната на роварах, і роварны футбол... Усе ўдзельнікі атрымалі карысныя падарункі: пульсометры, заплечнікі, бутэлькі для вады... Разыгралі ў той дзень і два веласіпеды. Адзін з іх дастаўся мінчанцы Софі. Менавіта яе нумар рэгістрацыі аказаўся самым шчаслівым. Дзяўчына на момант падвядзення вынікаў была дома, але да яе датэлефанаваліся, і праз гадзіну яна прыехала на ўрачыстае ўручэнне на сцэне.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**
dryla@zviazda.by



Фота Надзеі БУЖАН.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.29 | 20.45 | 15.16 |
| Віцебск — | 5.14 | 20.40 | 15.26 |
| Магілёў — | 5.19 | 20.35 | 15.16 |
| Гомель — | 5.21 | 20.26 | 15.05 |
| Гродна — | 5.45 | 20.59 | 15.14 |
| Брэст — | 5.51 | 20.54 | 15.03 |

### Месяц

*Апошняя квадра 30.04 — 05.05.*

*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

**Пр.** *Аляксандра, Гаўрылы, Рыгора, Фёдара.*

**К.** *Антаніны, Марыі, Ніны, Аляксандра, Пятра, Святаслава.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Сказаць «кахаю» — бывае складана.**

**Сказаць «прабач» — яшчэ складаней.**

**Сказаць «мне не налівайце» — увогуле не рэальна.**

— Ганначка, а хадземце ноччу на мора голымі купацца!

— Вой, Пятро, а я ж плаваць не ўмею!

— А мы і не будзем!

**— Іда Казіміраўна, вы ж інтэлігентная жанчына, а ўдарылі нашага старшага навукова супрацоўніка прасам, якая ж гэта самаабарона?**

**— Не знайшлося, ці ведаеце, веера пад рукой.**

Малады чалавек усё пытае і пытае, якая ў мяне любімая шакаладка. А мне сорамна прызнацца ў тым, што якую ні дасі — любую з'ем.




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С.РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 1729.

Нумар падпісаны ў 19.30 2 мая 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12